Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 339 (4245)
Серада, 23 сьнежня 1931 г.
МЕНСК, Савецкая 82

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ—6 умоў тав. Сталіна ў работу лясной прамысловасьці (1 стар.). С. Ж.—Ажыўленьне ў лягеры польскага фашызму. М. ДАШКЕВІЧ—Грамадзкае харчаваньне адно з важнейшых зьвеньняў сацыялістычнай будоўлі (2 стар.). З. ПАЛЯКОЎСКІ—У барацьбе за высокія тэмпы работы транспарту (3 стар.).

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ АБ АБРАНЬНІ САКРАТАРОЎ ЦК КП(б)Б т. т. ІВАНОВА І РЫСКІНА

На 20-га сьнежня гадавы плян збожжазагатовак па рэспубліцы выкананы толькі на 72,2 проц. Лён з глыбінак на базы прамысловасьці. Гаспадарча-разрахунковыя брыгады заводу «Пралетары» дабіліся перавыкананьня прамфінпляну ў ліквідацыі браку (1 стар.).

Новымі перамогамі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва адзначаюць працоўныя БССР адкрыцьцё сэсіі Саюзнага ЦВК (2 стар.).

З бальшавіцкай непрымірымасьцю змагацца супроць трацкісцкай кантрабанды, супроць гнілога лібералізму. (3 стар.).

АБ РЭСПУБЛІКАНСКІХ І МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАХ—пастанова ЦВК і СНК СССР (4 стар.).

6 умоў т. Сталіна--у работу лясной прамысловасьці

Узрастаючая патрэбнасьць капітальнага будаўніцтва, прамысловасьці, будаўніцтва ў калгасах і саўгасах у лесаматар'ялах, выкананьне экспартных плянаў, вялізарная ўдзельная вага дроў у апалавым балансе краіны, — надаюць асабліва вялікае значэньне задачы ажыцьцяўленьня праграмы лясной прамысловасьці.

Сьнежань 1931 году і першы квартал 1932 г. зьяўляюцца рашаючымі ў ажыцьцяўленьні плянаў загатовак і вывазкі лесу.

Між тым цяперашнія тэмпы работы лясной прамысловасьці ні ў якім разе не забясьпечваюць выкананьня адказнейшых задач, што стаяць перад лесаза-загатоўчымі арганізацыямі.

Аб гэтым сыгналізуюць даныя аб рэйдзе паасобных леспрамгасаў. Аб гэтым гаворыць наступная тэлеграма, атрыманая намі ад Галоўлеспраму і ЦК саюзу лесдрэўрабочых:

«Для забесьпячэньня лесам, асабліва адказных будоўляў, паводле згоды ВСНГ і НКПС, у БССР выдучаны 9 пагрузачных пунктаў, якія павінны вывезьці новабудоўлям 1223 пляцформы з лесаматар'ялам. На 15-га сьнежня адгружана толькі 257 пляцформ. Стварылася ўпэўная пагроза забесьпячэньню лесам рашаючых будаўніцтваў. Просім вашай актыўнай дапамогі ва ўзмацненьні падвозу гатовай прадукцыі, у арганізацыі кругла-сутачнай бесьперабойнай адгрузкі».

На 11-га сьнежня загатоўлена будаўнічага лесу толькі 55,2 проц. праграмы 4-га кварталу, дроў — 55,7 проц.; вывезена адпаведна 7,7 проц. і 11,6 проц.

Гэтыя ганебныя лічбы выкананьня кіраўніцтвам выключна дрэннай работай лясцовых арганізацый, іх няўменьнем маблізаваць унутраныя рэсурсы, рэалізаваць паказаньні тав. Сталіна, у прыватнасьці ўкараніць у лесе прасьцейшыя механізмы.

Усякія спасыланьні на «аб'ектыўныя» прычыны: на недахоп рабочай сілы, на дрэннае забесьпячэньне лесарубаў, — ня вытрымліваюць ніякай критыкі. Яны зьяўляюцца толькі шырмай для прыкрыцьця апартуністычнай пядоньчасьці раду арганізацый перабудаваць работу ў лесе па-новаму.

Возьмем адно з асноўных зьвеньняў загатовак — забесьпячэньне лясных работ рабочай сілай. Што зроблена для вярбоўкі лесарубаў і возчыкаў? Лесазагатоўчыя арганізацыі не перанялі яшчэ да арганізаванага набору рабочай сілы. Самацёк выяўляецца—у фармальным заключэньні дагавораў, у адсутнасьці кантролю за іх выкананьнем, у слабай увазцы дагаворнай кампаніі з шырокай масавай работай на папулярызацыі адыходніцтва на лясныя работы.

Таму няма нічога дзіўнага ў тым, што з 28.000 завербаваных лесарубаў, працуюць 4.000—15 проц., а з 25.000 возчыкаў—калі 1.000—4%.

У магілеўскім леспрамгасе працуе толькі каля 5% завербаваных калгаснікаў. У радзе раёнаў калгасаюзы супраціўляюцца адыходніцтву калгаснікаў у лес (Рэчыца, Барысаў). Чачэрскі райкалгассаюз адмовіўся даць дазвол на вярбоўку.

Лесазагатоўкі ў гэтым годзе праходзяць у асабліва сприяючых умовах, калі палова бядняцка-серадняцкіх гаспадарак аб'яднана ў калгасы. Ад уменьня правільна арганізаваць набор калгаснікаў па лясным работы, зламаць апартуністычнае супраціўленьне паасобных кіраўнікоў калгасаў, растлумачыць калгаснікам тыя ільготы, якія яны атрымліваюць па лясных работах—залежыць забесьпячэньне лесазагатовак рабочай сілай.

Гэта, аднак, ні ў якім разе не азначае, што аднаасобнік павінен «выпасьці» з пад увагі лесазагатоўчых арганізацый. Ігнараваньне аднаасобнікаў — грубае апартуністычнае скажэньне палітыкі арганізаванага набору рабочых. Аднаасобнік займае яшчэ значную ўдзельную вагу ў балансе рабочай сілы на загатоўках. Патрэбна самая шырокая масавая работа, каб прыцягнуць яго да працы ў лесе.

«Ліквацкае» ігнараваньне аднаасобных гаспадарак у радзе раёнаў (Рэчыца, Буда-Кашалёўскае) злучаецца з адсутнасьцю націску на кулака, які вядзе шалёную агітацыю за зрыў загатовак і сабатуе выкананьне цьвёрдых заданьняў. Цьвёрдыя заданьні выкананы на больш, як на 25 проц. Гэта лічба даволі выразна характарызуе слаўнасьць апартуністычных адносін да кулацка-заможных элемэнтаў.

Палітыка самацёку ў вярбоўцы прывяла да вельмі дрэннага становішча з вывазкай лесу і дроў. У леспрамгасах, прымацаваных да Менску і Віцебску, ляжыць больш 1 млн. раўмэтраў дроў, колькасьць, якая можа задаволіць поўную зімовую патрэбу гарадоў і прамысловасьці ў апале. У адных толькі асноўных леспрамгасах — Рэчыцкім, Глускім, Асіповіцкім знаходзіцца больш паўмільёна раўмэтраў. Рашаючыя дрывяныя раёны — Рэчыцкі, Асіповіцкі — вывезьлі ад 5,5 проц. да 10 проц. пляну.

Дрэнны ход вярбоўкі тлумачыцца таксам непадрыхтаванасьцю леспрамгасаў да прыёму рабочых. Забесьпячэньне лесарубаў і возчыкаў не наладжана. Сталовак адкрыта менш паловы вызначанай колькасьці. У рад леспрамгасаў не завезены патрэбныя тавары. Не хапае нават коламазі, у якой возчык адчувае вострую патрэбу.

Барацьба за культурны барак, за чыстую сталоўку, за ўзоры мэдпункт у лесе, за ўкараненьне ў баракі радыё і кінэўстановак ня стала ў цэнтры ўвагі мізавых, партыйных і прафесыянальных арганізацый. Задача паляпшэньня бытавых умоў лясных рабочых вырашаецца яўна нездавальняюча.

Вопыт брыгаднай работы ў лесе даў яркі прыклад таго, што яна зьяўляецца лепшым мэтадам сацыялістычнай арганізацыі вытворчасьці, што яна забясьпечвае нячуваны рост прадукцыйнасьці працы лесарубаў і возчыка (работа брыгад у Аршанскім і Быхаўскім леспрамгасах). Аднак, дагэтуль у лесе пануе яшчэ вокавечная арцельшчына з не нязьменнай спадарожніцай — ураўнілаўкай. На брыгадныя мэтады пераведзена менш 25 проц. рабочых.

Пагалоўны ахват лесарубаў і возчыкаў брыгаднымі мэтадамі працы — баявая задача, якая павінна быць ажыцьцёўлена ў самы кароткі тэрмін.

Абавязак прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый — ліквідаваць арцельную ўраўнілаўку, увесьці прагрэсыўна-прэміяльную зьдзельшчыну, дыфэрэнцыяваную аплату працы ў брыгадах, разгарнуць сацспаборніцтва. Яркім прыкладам ураўнілаўкі зьяўляецца зарплата лесарубаў і возчыкаў: возчык з канём дагэтуль атрымліваў на 60 кап.-1 руб. менш. лесаруба.

Дагэтуль вельмі мала зроблена, каб перавесьці леспрамгасы на гаспадарчы разрахунак, каб давесьці апошні да нізавых зьвеньняў — вучасткаў, брыгад.

Кожная брыгада, кожны вучастак павінны мець свой выразны вытворчы плян. Барацьба з ураўнілаўкай дасьць вынікі толькі тады, калі леспрамгасы наладзяць штодзенны ўлік працы лесарубаў.

Трэба з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што далейшае разьвіцьцё лясной прамысловасьці ўпраецца ў мэханізацыю — асноўнае зьвяно сацыялістычнай рэканструкцыі лясной вытворчасьці. У лесе працуе толькі 28 маторных піл. На вывазцы заняты толькі 3 вусеспічныя трактары. Лежнявыя і палепшаныя санныя шляхі, якія ў тры разы павялічваюць вываз — у бясспрытульным становішчы. Надзвычай павольна ідзе будаўніцтва вузкакалеек. Вельмі мала зроблена, каб укараніць мэханічныя ўстаноўкі для скарыстаньня адкідаў лесу, іх бракатыроўкі, што можа даць вялікую колькасьць дадатковага апалу.

Паўхільна ажыцьцяўляючы мэханізацыю лясных работ, лесазагатоўчыя арганізацыі ні ў якім разе не павінны забываць, што важнейшую ролю ў лесе яшчэ адыгрываюць сякера, піла і конь. Належная ўвага павінна быць аддана арганізацыі ўласнага транспарту лесапрамгасаў.

Ліст Галоўлеспраму і ЦК Лесдрэўрабочых, прыведзены вышэй, зьяўляецца папераджальным сыгналам для лесазагатоўчых арганізацый БССР — аб неабходнасьці рашуча перабудаваць работу ў лесе па-новаму.

Лясная эстафэта, якая абвешчана ўсебеларускім штабам па дапамозе лесазагатоўкам, павінна даць рашаючы пералом.

БССР трэба выйсьці у перадавыя калёны пераможнаў на лясным фронце.

Усесаюзны рэйд-паход за рэалізацыю 6 умоў тав. Сталін

ГАСПАДАРЧА-РАЗРАХУНКОВЫЯ БРЫГАДЫ ГОМЕЛЬСКАГА ЗАВОДУ „ПРАЛЕТАРЫ"

дабіліся перавыкананьня прамфінпляну і ліквідацыі браку

Перавод на гаспадарчы разрахунак выклікаў уздым прадукцыйнасьці працы

ГОМЕЛЬ. На мэшына-будаўнічым заводзе «Пралетары» яшчэ ў кастрычніку перашлі на гаспадарчы разрахунак брыгада па зборцы лябёдак і два такарныя варштаты № 32 і 3.

Практычны вопыт гэтых адзінак быў скарыстаны для лепшага ўкараненьня гаспадарчага разрахунку на фабрыцы. Былі дэтальна распрацаваны пытаньні аб сыстэме ўліку, аб прэміраваньні, аб выкананьні і перавыкананьні колькасных і якасных паказальнікаў. Склікаліся шырокія вытворчыя парады. Бюро ІТР арганізавала спэцыяльную брыгаду ў дапамогу цэхавым арганізацыям.

У выніку, да пачатку сьнежня на гаспадарчы разрахунак перашлі 12 брыгад і 15 варштатаў.

Гэта значна спрыяла далейшаму ўздыму творчага энтузіязму. Рабочыя гаспадарча-разрахунковых брыгад і варштатаў прымалі актыўны ўдзел у абмеркаваньні вытворчых плянаў, норм выдатканьня матар'ялаў, тэрміну карыстаньня інструмантамі, высоўвалі сустрэчныя пляны і г. д. Пераход на гаспадарчы разрахунак выклікаў рост адказнасьці рабочых за кожны процант заданьня.

Першыя практычныя рэзультаты даказалі на справе, што гаспадарчы разрахунак у нізавых зьвеньнях вытворчасьці — зьяўляецца магутнай зброяй у барацьбе за павышэньне прадукцыйнасьці працы, за зьнижэньне сабекошту прадукцыі.

Брыгада па зборцы лябёдак, якая раней сыстэматычна ня выконвала прамфінпляну, пасьля пераводу выканала сваё заданьне на 108 проц., дабілася эканоміі па далямаможных матар'ялах на 63 проц., павышэньня прадукцыйнасьці працы на 22 проц. Зусім ліквідаваны брак.

Гаспадарча - разрахунковы варштат за два тыдні дабіўся перавыкананьня праграмы на 22,5 проц. зьнижэньня сабекошту на 8,8 проц. Рабочыя ліквідавалі прагулы і спазьненьні.

Аднак, нельга не адзначыць, што пры пераходзе брыгад і варштатаў на гаспадарчы разрахунак, і пры ўвядзеньні сустрэчна-зьменных плянаў прыйшлося спаткацца з такімі разважаньнямі: «Раней выканаем прамфінплян, а потым будзем праводзіць гаспадарчы разрахунак». У арматурным цэху адзін са зьменных майстраў сарваў ажыцьцяўленьне сустрэчна-зьменнага пляну. Апартуністычныя адносіны да вышэйшых форм сацспаборніцтва і ўдарніцтва павінны атрымаць самы рашучы адпор.

Перад трыкутнікам заводу стаіць задача далейшага разгортваньня гаспадарчага разрахунку—магутнага вагара выкананьня прамфінпляну.

Г. Плоткін.

„Спартак" недадаў 1600 тон паперы

ШКЛОЎ (наш кар.). Папяровая фабрыка «Спартак» амаль не прыступіла да правядзеньня ў жыцьцё пасьці паказаньняў тав. Сталіна. У выніку на фабрыцы прамфінплян сыстэматычна невыконваецца. У 3-м квартале праграма недавыканана на 25,1 проц., у кастрычніку на 28,1 і ў лістападзе на 37,3. Фабрыка недадала дзяржаве звыш 1600 тон паперы.

Калі спытацца ў адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу, як стаіць справа з гаспадарчым разрахункам, дык вам бязумоўна адкажуць: «У нас гаспадарчы разрахунак праводзіцца добра. Усё ў парадку». Але пераход праведзен чыста фармальна. На гаспадарчым разрахунку працуюць 3 брыгады —Бзрнатовіча, Бароўскага і Байкова, але ні адна з іх не заключыла нават дагавору з адміністрацыяй. На фабрыцы толькі пачынаюць гутарыць аб увядзеньні прэміяльна - прагрэсыўнай зьдзельшчыны.

За апошні час прастоі павялічыліся да 24 проц. Значная частка іх выклікана падобраякасным, несвоячасовым рамонтам машын.

Той факт, што сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам ахоплена толькі 55 проц. рабочых гаворыць сам за сабе. За кастрычнік па фабрыцы прагулы, па паважлівых прычынах, дасягнулі 270 чалавекадзён.

Мала ўвагі аддаецца паляпшэньню якасьці прадукцыі: падлік браку з адну зьмену на 3-й машыне, якая вычэсвае паперу «вэркэ» дасягнуў 21 проц.

На фабрыку прывозіцца часта мерзлы сырэц, што таксама адбіваецца на якасьці паперы.

Тэхнічная вучоба рабочых зусім не наладжана, тэхгурткі існуюць толькі на паперы. Фабрычная шматтыражка «Голас спартакаўца» некалькі разоў сыгналізавала аб тым, што галоўны мэханік Рыцкі і загадчык вытворчасьці Шнэйдэрман марынуюць вытворчыя прапановы, адмаўляюцца ня прыняты меры, каб правесьці ў жыцьцё рацыяналізатарскія прапановы.

Толькі рэалізацыя шасьці ўмоў тав. Сталіна можа вывесьці фабрыку з таго нездавальняючага становішча, у якім яна знаходзіцца.

КУНІНА.

„Дубровенская мануфактура" яшчэ не перабудавала работу па-новаму

ДУБРОЎНА. Некалькі лічбаў характарызуюць работу фабрыкі «Дубровенская мануфактура». Трэці квартал фабрыка скончыла выкананьнем 70,8 проц. прамфінпляну, чацьверты квартал ня даў паляпшэньня. За першыя два месяцы вытворчая праграма выканана на 55,7 проц.

— У нас не хапае сырцу, дрэнна з рабочай сілай — тлумачаць прычыны адставаньня фабрыкі яе кіраўнікі. Гэтыя тлумачэньні нікуды ня вартыя. Цікучасьць рабочай сілы, абязьлічка, дрэнные забесьпячэньне рабочых, адсутнасьць культурна-масавай работы і, нарэшце, няўмелае кіраўніцтва выклікалі тое, што фабрыка не дадала некалькі соцень тысяч мэтраў дэфіцытнай тэкстыльнай прадукцыі.

Вось факты:

Да сёнешняга дня ні адзін цэх, брыгада і група не перашлі на гаспадарчы разрахунак. Рабочыя дагэтуль ня ведаюць добра, што азначае гаспадарчы разрахунак, якая яго роля ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну. У цэхах панае поўная абязьлічка. Асабліва гэта заўважаецца ў ткацкім цэху. Рабочыя перакідваюцца штодзенна з аднаго варштату на другі. Калі работніца захварэе, дык пасьля прыходу на работу, яна ніколі не становіцца ля свайго варштату. Агідна дрэнна выконваюцца рамонтныя работы. Штодзенна ў ткацкім цэху стаяць 10-15 неадрамонтаваных варштатаў.

У адным толькі лістападзе ў ткацкім цэху прастояла 30 проц. варштатаў з прычыны дрэннай работы рамонтнага цэху.

Кіраўніцтва фабрыкі бязьдзейнічае ў галіне набору і падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы. Пасьля адпускоў па фабрыку не зьвярнуўся больш 100 кваліфікаваных рабочых. Прычыны — дрэнныя бытавыя ўмовы. ЗГК фабрыкі зусім нездавальняюча забясьпечвае рабочых прадуктамі. ЗРК нічога не зрабіў, каб правесьці самазагатоўкі. Мелі месца выпадкі перабоі ў выдачы цукру, мукі і г. д.

Культурна-масавая работа — забыты вучастак. У ткацкім цэху за 3 месяцы выпушчаны 2 штодзенкі. У рамонтным цэху штодзенка вісіць без зьмен з 7-га кастрычніка. Для таго каб фабрыка ліквідавала сваё адставаньне, партыйныя і прафесыянальныя арганізацыі павінны перабудаваць сваю работу па-новаму.

Г. Ямзін.

АД РЭДАКЦЫІ: яшчэ 25 кастрычніка ў артыкуле «716.000 мэт. мануфактуры — запазычанасьць Дубровенскай фабрыкі» «Зьвязда» пісала аб зусім нездавальняючай рабоце Дубровенскай мануфактуры. З таго часу прайшло каля двух месяцаў, а становішча нікольці не палепшылася. Мы пытаемся ў Дубровенскага раённага камітэту КП(б)Б, што зроблена ім, каб аздаравіць работу фабрыкі, каб ліквідаваць яе адставаньне?

ЛЁН З ГЛЫБІНАК--НА БАЗЫ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

Узьняць якасьць валакна

Тэмпы вывазу загатоўленага ільнавалакна з глыбінных пунктаў і здачы апрацаванага ільну на базы прамысловасьці выклікаюць сур'ёзную небясьпеку. За кастрычнік замест 917 тон асноўныя загатоўшчыкі і заводы здалі базам і адгрузілі прамысловасьці ўсяго толькі 64 тоны, або 8,9 проц. За лістапад замест 2.596 тон здана і адгружана 961 тона, або 36,2 проц.

Такое становішча з прасоўваньнем ільну да прамысловасьці недапушчальна. Калі зараз-жа ня будуць прыняты рашучыя меры і ня будзе дасягнут рэзкі пералом у гэтым напрамку, тэкстыльная прамысловасьць стане перад пагрозай перабояў з-за недахвату сырцу.

За апошні час назіраюцца шматлікія факты зьнижэньня якасьці ільнавалакна асабліва ў паўднёвых раёнах БССР. Замест запрасткаванага плянам сярэдняга нумару валакна для прамысловасьці 9-4, а наогул па БССР—7-9-8 на базы паступае лён сярэдніх нумароў 6-5-7. Па некаторых паўднёвых раёнах, у прыватнасьці па раёнах, якія абслугоўваюцца Гомельскай, Калінкавіцкай, Бабруйскай і Слуцкай базамі—на 50-60 проц. паступае сырэц № 2, якога і зусім няма ў дзяржаўным стандарце для сырцу першай групы. Такі лён фактычна ня прыгодны як для патрэб прамысловасьці, так і для сапрамкала пярацы.

Многія раённыя арганізацыі зусім не звяртаюць увагі на якасьць здаванага ільнавалакна і дапушчаюць прыём загатоўшчыкамі самых нізкіх гатункаў.

Узмацняючы тэмпы ільназагатовак, неабходна прыняць усе меры, каб на загатоўчыя пункты валакно здавалася высокай якасьці, згодна ўстаноўленых стандартаў.

Кулацкай дзяльбе ільну—бязьлітасны адпор

ПОЛАЦАК. (Белта). Апошняя дэкада не дала ніякага эруху ў ходзе апрацоўкі ільну. Па 10-га сьнежня агульны раённы плян загатовак ільну выканаў на 18,5 проц. і на 40 проц. па ільнасемі.

У буйнейшых ільнаводчых калгасах раёну імя Фрунзэ, «Камінтэрн», імя Дзяржынскага, апрацоўка ільну вусіх не пачыналася. Яшчэ ня створаны брыгады, ільнамялныя машыны ўвесь час стаяць не нагружаныя.

Калгас імя Парыскай Камуны, скончыўшы апрацоўку ільну, разьмеркаваў яго сярод калгаснікаў, тады як плян на ільнавалакне выкапан усяго на 50%

Парыцкі, Рагачоўскі і Жлобінскі раёны здаюць лён сырцом

БАБРУЙСК, 18. (Белта). Паступленьне ільнавалакна на бабруйскую базу Белтэкстыльаб'яднаньня ад 8-мі прымацаваных раёнаў праходзіць вельмі павольна. На 15-га сьнежня паступіла 220 тон. ці 20,7 проц. гадавога заданьня. Яшчэ горш праходзяць загатоўкі пянькі. Загатоўлена 5 тон пры заданьні ў 960 тон.

Раённыя базы вельмі марудзяць з адпраўкай ільну са сваіх загатоўчых пунктаў. Па глыбінных запчынках ляжыць больш 200 тон ільнавалакна. Асобнай прычынай гэтага—недагляд загатоўшчыкаў, якія прымалі ільнавалакно нагвазаным.

Загатоўшчыкі мала ўвагі зварачаюць на якасьць ільнавалакна. Парыцкі раён на 90 проц. здае лён сырцу, Рагачоўскі, Жлобінскі—на 80 проц.

Т. т. Рыскін і Іваноў абраны сакратарамі ЦК КП(б)Б

Інфармацыйнае паведамленьне

Згодна пастановы апошняга пленуму ЦК УсеКП(б) аб вылучэньні нац. ЦК, крайкомамі і абкомамі сакратароў па транспарце і снабжэньні, ЦК КП(б)Б выбраў сакратарамі ЦК КП(б)Б па транспарце **т. Іванова** *і па снабжэньні* **т. Рыскіна**, *кааптаваўшы т. т. Іванова і Рыскіна ў склад пленуму ЦК і ўвёўшы іх у склад бюро і сакратарыяту ЦК КП(б)Б.*

Тав. РЫСКІН А. Б.

Нарадзіўся ў 1899 годзе ў сям'і дробнага рамесьніка. Член РСДРП(б) з 1916 году (уступіў у юзэўскую падпольную партарганізацыю). На працягу 10 год тав. Рыскін, пачынаючы з 1910 году, працуе па найме ў розных шэйных майстарнях Рагачова, а потым Юзаўкі (Сталіна). Ужо з 1915 году тав. Рыскін прымае актыўны ўдзел у прафесыянальным руху—член стачачнага камітэту, сакратар праўленьня саюзу шэйнікаў Юзаўкі, старшыня таго-ж саюзу ў Рагачове, старшыня прафсавету, член прэзыдыуму губпрафсавету ў Гомелі.

У 1917 годзе тав. Рыскін—адзін з арганізатараў рагачоўскай партарганізацыі, а ў часе польска-нямецкай акупацыі (1918 год)—кіраўнік падпольнай бальшавіцкай арганізацыі ў Рагачове. З 1919 па 1921 год—член Рагачоўскага пазатовага камітэту партыі, з 1921 па 1923 год—член Гомельскага губкому. З 1923 па 1924 год—тав. Рыскін працуе сакратаром Магілёўскага пазатовага і адначасова зьяўляецца членам Бельбюро ЦК УсеКП(б), а потым—сакратаром акругкому КП(б)Б; у 1925 годзе—сакратаром віцебскага акругкому. У гэтым-жа годзе тав. Рыскін выбіраецца членам ЦК КП(б)Б.

У апошнія гады тав. Рыскін—сакратар партколегіі і нам. старшыні ЦКК КП(б)Б. Член ЦВК БССР, неаднаразовы скліканьня, а цяпер—член прэзыдыуму ЦВК БССР.

Тав. ІВАНОЎ І. Я.

Нарадзіўся ў 1898 годзе. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі працаваў у майстарнях Менскага чыгуначнага вузла (б. Аляксандраўскай чыгункі). Пасьля Кастрычніка да 1922 году служыў у Чырвонай арміі. З 1922 году быў кіраўніком матар'яльнай службы станцыі Менск МББ чыг., а потым сакратаром ячэйкі службы цягі МББ, сакратаром Кастрычніцкага райкому КП(б)Б, гарпайкому і зноў Кастрычніцкага райкому.

У 1926 годзе выбран старшынёю Бельбюро ЦК чыгуначнікаў, на гэтай рабоце быў да 1928 году. Пасьля гэтага працаваў старшынёю ЦП саюзу мэталістаў.

На XIII зьезьдзе КП(б)Б выбран членам прэзыдыуму ЦКК і намесьнікам наркома РСІ БССР. З 1927 па 1929 год зьяўляўся членам ЦК КП(б)Б.

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа прыватніку" (ЦК УсеКП(б)

На 20 сьнежня гадавы плян збожжазагатовак

па рэспубліцы выкананы толькі на 72,2 проц.

Да гэтага часу яшчэ ёсьць калгасы, якія недапушчальна зацягваюць здачу збожжа

23 сьнежня

4-ая пяцідзёўка сьнежня не дала ніякага эруху ў ходзе збожжазагатовак. Тэмпы па-ранейшаму засталіся вуёмі нездавальняючымі. Загатоўленае за 5 дзён збожжа складае ўсяго 3 проц. гадавога пляну. У сярэднім па рэспубліцы агульны плян збожжазагатовак на 20 сьнежня (уключна) выкананы на 72,2 проц. Гэтыя даныя сыгналізуюць аб сур'ёзнай пагрозе невыкананьня гадавога пляну ў тэрмін, вызначаны партыяй і ўрадам—1 студзеня 1932 году.

Калгасны сэктар павінен быў поўнасьцю скончыць здачу збожжа да 15-20 сьнежня. Між тым, заданьне па гэтым сэктары выкананa ўсяго на 35,5 проц. Такім чынам, калгасы засталіся ў значным даўгу перад дзяржавай. Гэты доўг павінен быць ва што-б там ні стала пагашан у бліжэйшыя-ж дні.

Самым адсталым вучасткам зьяўляецца адноасобны сэктар, які выканаў гадавы плян толькі на 64,3 проц. Прырост за пяцідзёўку складае ўсяго 1,7 проц. Гэта тлумачыцца тым, што ў радзе месц усё яшчэ ня зжыта апартуністычная недаацэнка ролі аднаасобніка ў збожжазагатоўчай кампаніі, ігнаруецца масава-палітычная работа сярод беднякоў і сераднякоў.

Ня ўсюды мясцовыя арганізацыі забясьпечылі рашучы націск на кулацка-заможныя элемэнты. У значнай частцы раёнаў плян стагнацыя цьвёрдых заданьняў дагэтуль яшчэ ня выкананы.

Зусім дрэнна стаіць справа з паступленьнем памольнага збору. На 20 сьнежня плян гарнца выкананы толькі на 43,4 проц.

Баявая задача ўсіх партарганізацый, усёй пралетарскай грамадзкасьці—неадкладна забясьпечыць павышэньне тэмпаў загатовак збожжа па ўсіх сэктарах. Засталося 8 дзён. За гэты час трэба ва што-б там ні стала поўнасьцю нагнаць прапушчанае, ліквідаваць адсталасьць на ўсіх вучастках з тым, каб чацьверты, заключны год пяцігодкі спаткаць пасьпяховым завяршэньнем збожжазагатоўчай кампаніі.

Ліквідаваць ганебнае адставаньне

РАГАЧОЎ. Калгасны сэктар раёну недапушчальна адстае ў збожжазагатоўках. Гадавы плян па 15 сьнежня выкананы толькі на 54,6 проц. Гэта тлумачыцца тым, што праўленьні раду калгасаў не разгарнулі барацьбы за свячкавае і поўнае выкананьне заданьняў па здачы збожжа, прадаставіўшы гэтую кампанію самацёку.

У паасобных калгасах яшчэ ня вытручаны канчаткова кулацка-рвацкія тэндэнцыі — забясьпечыць з пачатку сабе, а потым налумаць аб выкананьні абавязкаў перад дзяржавай. Так, калгас «Камінтэрн», Гарадзецкага сельсавету, выканаўшы сваё заданьне па 11 проц., зусім спыніў здачу збожжа.

У калгасе «Чырвоны молат», Забалоцкага сельсавету, дагэтуль яшчэ ня скончан абмалот. Заданьне па здачы збожжа дзяржаве выкананa толькі на 40 проц. Праўленьне калгасу, на чале са старшынёй Ягамосьцевым, падпаўшы пад кулацкі ўплыў, няўмысьля запягвае абмалот з тым, каб сарваць заданьне па здачы збожжа. «Пляны нерэальныя» — разважаюць праўленцы.

Трэба з усёй рашучасьцю ўдарыць па кулацка-спажывецкіх тэндэнцыях, па разважаньнях аб «нерэальнасьці пляну». Калгасы Рагачоўшчыны могуць і павінны поўнасьцю выкананць свае абавязкі перад пралетарскай дзяржавай. Рэальнасьць пляну даведзена поўнасьцю перадавымі калгасамі, якія ўжо выканалі і перавыканалі заданьне. Да гэтых калгасаў адносяцца: «Хлебароб» (Доўскі сельсавет), «Чырвоны вострaў» (Побалаўскі сельсавет), імя Сьвярдлова (Сьвяцкі сельсавет), «Ударнік», «Новае Падбудзьдзе», «Герой» і інш.

Па іх павінны раўняцца ўсе калгасы Рагачоўшчыны.

КЛІМОВІЧ Я.

Зацягваюць абмалот

КОЙДАНАВА. Побач з перадавымі калгасамі (імя Вархлеўскага, «Новы шлях», «Чырвоны маяк», «Інтэрнацыянал», «Камунар», «Чырвоны Кастрычнік» і інш.), якія з посьпехам выканалі і перавыканалі заданьне па здачы збожжа, ёсьць калгасы ганебна цягнецца ў хвасьце загатовак.

Так, калгас імя Будзённага, выканаў сваё заданьне толькі на 33 проц. у той час, як суседні калгас «Інтэрнацыянал» пры наяўнасьці толькі адной малатарні поўнасьцю скончыў абмалот і выканаў заданьне па здачы збожжа. Калгас-жа імя Будзённага, які мае тры малатарні, яшчэ нават не разгарнуў малацьбы. Усе тры малатарні стаяць без руху.

Марудзяць з абмалотам і здачай збожжа калгасы імя Сталіна, «Перамога», «XIII Кастрычнік» і інш.

Раённыя арганізацыі і ў першую чаргу райкалгассаюз, павінны зараз-жа прыняць меры для максымальнага ўзмацненьня абмалоту і забясьпечэньня поўнага выкананьня пляну збожжазагатовак усімі калгасамі Койданаўшчыны.

Юльлеў.

ЗВОДКА

аб загатоўцы тэхнічных культур у БССР на 16 XII 1931 году ў процантах

	Ільнасемя	Ільнавалакно	Пянька	Каноплі
Белкаапсаюз	54,5	30,9	3,7	14,1
Белільнасаюз	61,7	34,4	1,6	21,0
Агульны	58,6	33,3	3,3	15,6
Па сэктарох				
Калгасы МТС	58,8	32,5	—	10,0
Калгасы	95,3	49,4	1,7	26,4
Па іншых сэктарох	43,0	23,8	5,6	11,5

Ажыўленьне ў лягэры польскага фашызму

Манчжурскі канфлікт акрылёў надзеяй польскі фашызм на магчымасьць сканай антысавецкай авантуры. «Ілюстраваны Кур'ер цодзенны» ў адным са сваіх апошніх нумароў з задаваленьнем пісаў: «праўдападобна, што ў Манчжурыю будуць увезены савецкія войскі для заняцьця і акупацыі КУЧ, а гэта будзе сыгналам да ўзброенай сутычкі паміж Японіяй і бальшавікамі» сыгналам да ваеннага нападу імпэрыялістаў на Савецкі Саюз, што дасьць магчымасьць фашысцкай Польшчы ажыцьцявіць яе захватніцкія, грабежніцкія пляны ў адносінах да СССР.

І сапраўды, на справе мы бачым, як манчжурскі канфлікт ускалыхнуў польскую ваеншчыну. Фашысцкая прэса адразу-ж узмацніла правакацыйную антысавецкую кампанію. Зноў выплываюць на сцэну набіўшыя ўсім аскомину «прымусовая праца», «тэрор», «праследаваньне рэлігіі». Фашысцкай прэсай падаюцца правакацыйныя весткі аб «паражэньнях» савецкага ўраду на збожжазагатоўчым, фінансавым, транспартным і іншым франтох і розныя іншыя нябылицы пра Савецкі Саюз. На вестку аб устучленьні Японіі ў Манчжурыю, маршал Пілсудскі зараз-жа едзе ў Бухарэст, дзе разам з румынскім генштабам выпрацоўваецца канчаткова плян узброенага нападу на Савецкі Саюз. Па патрабаваньні французкага генштабу Пілсудскі атрымлівае назначэньне генэралісумуса польска-румынскіх узброеных сіл.

У Лёндан выяжджае міністар замежных спраў Польшчы Залескі. У Варшаву прыяжджае міністар замежных спраў Югаславіі Марынковіч «з вінытам ветлівасьці» ў сапраўднасьці-ж абгаворвалася пытаньне аб скарыстаньні белагвардзейскіх банд, якія зараз знаходзяцца ў Югаславіі. Польшча і Румынія атрымліваюць ноцыя мільённым пазыкі ад Францыі на дазейшыя ўзбраеньні і падрыхтоўку вайны. З мэтай кансалідацыі ўсіх антысавецкіх сіл, у пачатку сьнежня ў Варшаве адбыўся зьезд пятлюраўскіх недабіткаў, а сам маршал Пілсудскі перад сваім адъездам у Румынію абяжджае прыгранічную паласу на Зах. Беларусі — будучы плацдарм ваенных дзеяньняў.

На французскіх вэрфях заказваюцца новыя падводныя лодкі і іншыя ваенныя судны для Польшчы. У Ліставадзе дастаўлены ў Гдыню дзьве нованабудаваныя на французскіх вэрфях падводныя лодкі «Вільк» і «Рысь», разам з падрыхтаванай у Францыі навадай. Распрацован нават плян вялікага ваенна-морскага будаўніцтва, прычым у бліжэйшы час Польшча мае пабудаваць два крэйсэры ёмкасьцю ў 10.000 тон, навейшай канструкцыі. Будуюцца новыя стратэгічныя чыгункі, шляхі, грунтавыя дарогі, асабліва па тэрыторыі акупаваных Зах. Беларусі і Зах. Украіны. Заключаецца дагавор з чэха-словацкай ваеннай фірмай «Шкода» на дастаўку зброі для Польшчы. Ня гледзячы на катастрафічны крызіс у краіне, ваенная прамысловасьць працуе бесьперабойна 24 гадзіны ў суткі. Машына падрыхтоўкі вайны працуе ў фашысцкай Польшчы поўным ходам.

Мала таго, лёнданскі карэспандэнт цэнтральнага органу фашыстаў «Фэль кіпэр бэобахтэр» паведамляе, што ў сувязі з падыходзячай канфэрэнцыяй па разбраеньні паміж Польшчай і Францыяй заключана згода, якая зводзіцца да наступнага:

Польшча заяўляе, што з прычыны бальшавіцкай небясьпекі на Ўсходзе і нацыянал - сацыялістскай небясьпекі ў Германіі, яна ня можа разбраіцца, а наадварот павінна ўзмацніць сваё ўзбраеньне. Аб якім небудзь разбраеньні Польшчы нагул ня можа быць і гутаркі з прычыны «савецкай небясьпекі». Гэта робіцца ў той момант, калі мірная палітыка Савецкага Саюзу вядома ўсяму сьвету, калі СССР ужо некалькі раз прапанаваў ураду Польшчы заключыць дагавор аб ненападзе, і калі буржуазная прэса Польшчы надаўна паведамляла аб згодзе польскага ўраду на прапанову Савецтаў такі дагавор заключыць.

Адначасова з гэтым, урад фашысцкай дыктатуры, урад голаду і вайны ўзмацняе тэрор супроць рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў самой Польшчы, так і асабліва на акупаваных ЗБ і ЗУ. Яшчэ не скончыліся масавыя яўрэйскія пагромы, арганізаваныя фашысцкай уладай, каб разьбіць адзіны рэвалюцыйны фронт працоўных усіх нацыянальнасьцяй, каб дэзарганізаваць узрастаючую хвалю рэвалюцыйнага руху. Лютуюць карныя экспэдыцыі на Зах. Беларусі і Зах. Украіне. Цэлыя вёскі зьмятаюцца з твару зямлі. Узмоцненым тэмпам дзейнічае зараз у фашысцкай Польшчы крывавая машына ваенна-палявых судоў. Краіна пакрываецца лесам шыбеніц. Фашысцкая дыктатура ў Польшчы, рыхтуючыся да інтэрвэнцыі, укараніе ў краіне «парадак» пры дапамозе фактычнага ўвядзеньня ваеннага становішча. У далым радзе раёнаў ЗУ і ЗБ сялянам забараняецца выходзіць на вуліцу пасьля 8 гадз. веч., нельга завешваць вокны, каб паліцэйскія патрулі маглі ў кожную мінуту бачыць, што робіцца ў сялянскіх хатах. У Варшаве па вуліцах рабочых кварталаў шныраюць патрулі паліцэйскіх і шпіёны і суправаджэньні турэмных карэтак, у якія кідаюць і тутжа зьбіваюць рабочых па адной тольки падазронасьці.

Гэты шалёны тэрор польскага фашызму накіроўан, супроць рэвалюцыйнага руху, на зьнішчэньне авангарду рэвалюцыйнага пралетарыяту—камуністычнай партыі, супроць працоўных. Масавыя забойствы рэвалюцыйных рабочых і сялян праз павешаньне ясна даказваюць, што польская буржуазія пры дапамозе шыбеніц імкнецца задушыць нарастаючую хвалю рэвалюцыйнага руху ў Польшчы, задушыць узрастаючыя сымпатыі працоўных мас да Савецкага Саюзу. Пакараньне сьмерцю рэвалюцыйных рабочых і сялян за удзел у дэманстрацыях супроць ваенных плянаў польскага фашызму ясна даказвае, што фашысцкая Польшча ў саюзе з французскім імпэрыялізмам уступіла ў новую фазу падрыхтоўкі інтэрвэнцыі супроць СССР. Масавыя прыгаворы да пакараньня сьмерцю праз павешаньне, якія асабліва пачасьціліся з моманту акупацыі японскім імпэрыялізмам Манчжурыі, прыгаворы, якімі фашызм хацеў бы застрашыць, стэрарызаваць рабочую клясу ў яе геройскай барацьбе пад кіраўніцтвам кампартыі супроць інтэрвэнцыяністкіх плянаў польскага імпэрыялізму, зьлучаюцца адным са зьвеньняў у ланцугу падрыхтоўкі інтэрвэнцыі.

Па ўсёй Польшчы ўзмоцнена вядзецца і апрацоўка грамадзкай думкі да вайны супроць краіны Савецтаў. Фашысцкая прэса, фашысцкія арганізацыі, сацыял-фашысты і беларускія нацыянал-фашысты, кулаччо,—увесь апарат фашысцкай дыктатуры пушчан у рух для апрацоўкі і падрыхтоўкі гарматнага мяса. Усё гэта робіцца сыстэматычна, кожны дзень і зусім адкрыта. Ніжэй мы падаем ліст селяніна Заходняй Беларусі, які дае падрабязны малюнак гэтай падрыхтоўкі польскага фашызму да ўзброенага паходу супроць СССР:

«Пра падрыхтоўку Польшчы да вайны супроць Савецкага Саюзу ў нас голасна гавораць усё, асабліва фашысты. І кожны тлумачыць яе па свойму. Адны глядзяць на гэтае зьявішча, як на пагібель самой польскай ваеншчыны, якая ў ваенай авантуры шукае выхаду з катастрафічнага становішча. Больш сьвядомыя з абурэньнем ганьбяць і вайну, і таго хто чакае яе. Кулаччо адкрыта агітуе за вайну, гаворачы, што Савецкі Саюз хоча напасьці на Польшчу. Апошняму мала хто верыць.

Асабліва такія весткі пашырыліся за апошні год. І гэта пацьвярджалася самай падрыхтоўкай польскай ваеншчыны: шырвараччным парадкам праводзіліся новыя дарогі, пашыраліся і папраўляліся старыя, палескія балоты парэзаны на безьліч каналаў і дарог удоўж і поперак. Усе гэтыя дарогі — для вайсковых мэтаў. Адна з такіх шасэйных дарог зпучае Тэпеханы з Слонімам, пераскакоючы шасэ Брэст-Баранавічы каля вёскі Любішчуцы. Каля тэй-жа вёскі падрыхтоўваецца пабудова лётнага парку і салдацкіх казармаў. На гэта ўрад. рыхтуецца праз канфіскацыю — адрэзаць ад зямлі сялянскай беднаты 250 га, як пішнюю (?).

У дапамогу правядзеньню гэтай палітыкі актыўна выступала мясцовае кулаччо на чале з солтысам Ланчукам.

У адказ на кулацкую агітацыю працоўнае сялянства вёскі выступіла на барацьбу. Нехта з нянавісьці да акупантаў і іх агентаў будынкі солтыса Ланчука пусьцілі з дымам, як падзяку за яго «працу». Супроць гэтага агента дыфэнзывы вёска яшчэ больш паднялася, калі даведалася, што гэта панская сабака атрымала звыш страхёўкі 3.500 зл. ад паветовага старасты за... верную службу.

Сяляне вёскі Боркі адмовіліся ад шырвараччу і мясцоваму кіраўніцтву работамі — паліцэйскаму і тэхніку— з насьмешкай параіці будаваць дарогі ў адваротным ад Сав. Саюзу кірунку. «Будуйце дарогі на Варшаву, каб гэтчай было ўцякаць, а тут мы ведаем і па гэтых дарогах як вас біць. І першыя нашы кулі ў часе паходу вашых жандараў супроць Савецкай Беларусі — будуць накіраваны ім у ілбы». За гэта з солтыса Даймяка сарвалі польскага пэўнл і пакарылі штрафам у 50 зл.

Чакаючы вайны, многія сяляне не хацелі касіць сена, лічачы, што ўсё яно будзе забрана польскай арміяй. Але група сялян з вёскі № інакш зрабіла. У адказ на гэта сяляне накасілі звыш 200 пуд., зпажыўшы асобна, як падарунак для Чырвонай коньніцы. Сяляне пры гэтым пастанавілі: «Жыцьцё паложым, але не дапусьцім панскай лапы да гэтага сена. На спатканьне Чырвонай арміі са зброяй у руках пойдзем, б'ючы па тыпох пэчоў».

Гэта толькі кропля таго, што зараз у нас робіцца. Амаль усё бяднейшае сялянства Косаўскага павету ахоплена барацьбой. Аб гэтым можа сьведчыць і тое, што з павету больш 200 перадавікоў трымаюцца ў турмах.

Аб гэтым часта можна чуць і ад самой паліцэйшчыны. — «Увесь Косаўскі павет збальшавізаваны», «усе ад старога і да малога камуністы», «цэлыя вёскі трэба зьнішчыць і зьмесьці з твару зямлі». Гэта словы нашых «апікуноў». Гэтыя словы выкрываюць пляны панскай ваеншчыны і яшчэ лапш умацоўваюць антыфашысцкія рады наўкол камуністычнай партыі Заходняй Беларусі».

Гэты ліст селяніна Зах. Беларусі не патрабуе каментараў. Фашысцкая прэса, ня гледзячы на тайны цыркуляр ураду — замоўчваць рэвалюцыйныя выступленьні ў Польшчы ня можа схаваць стыхійных рэвалюцыйных выступленьняў працоўных на ЗБ і ЗУ супроць улады акупантаў. Так, на працягу толькі аднаго апошняга тыдню фашысцкая прэса падавала пра замах на старшыню аб'яднаньня прэзьмешчаны два выпадкі перарэзваньня тэлефонных правадоў па лініі Парубанк-Новасёлкі і на вучастку паміж Падсьвільле-Дзевяніпкі. У Ашмянскім-жа павеце адбыта пад ваеннагалавы суд сялянка Маркоўская па падазрэньні ў падпале будынкаў кулака.

Ня гледзячы на шалёны фашысцкі тэрор, на дзеяньні ваенна-палявых судоў, хвалі рэвалюцыйнага руху ўсё больш грозна б'юць у падставы фашысцкай дыктатуры. Абурэньне пралетарыяту і працоўных Польшчы прымусіла нават фашысцкіх катаў скасаваць кару сьмерцю над двума рабочымі ў Петракове. Пралетарыят і працоўныя масы Польшчы, ЗУ і ЗБ, якія пад кіраўніцтвам кампартыі Польшчы вядуць гераічную барацьбу супроць фашысцкай дыктатуры, усё больш рашуча заяўляюць аб сваёй гатоўнасьці абараняць першую ў сьвеце рэспубліку Савецтаў — СССР. Гэта павінна быць грозным перасьцярогай польскаму фашызму ў выпадку яго антысавецкай авантуры.

С. Ж.

НОВЫМІ ПЕРАМОГАМІ на ФРОНЦЕ сацыялістычнага будаўніцтва

адзначаюць працоўныя БССР адкрыцьцё сэсіі Саюзнага ЦВК „Палесдрук" узнагароджан ордэнам Чырвонага Сьцягу

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

Дзякуючы правільнай пастаноўцы гаспадарчай і грамадзкай работы з боку партыйных, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый, мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, правільнаму скарыстаньню ўсяго машынага абсталяваньня, правядзеньню рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, на аснове шырока-разгорнутага сацспаборніцтва і ўдарніцтва, рабочыя і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал «Палесдруку», пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, выканалі пяцігодку за два з паловай гады і забясьпечылі поўнае і дагэрміновае выкананьне прамфінпляну 1931 г.

Адзначаючы заслугі калектыву лепшых ударнікаў і інжынэрна-тэхнічных работнікаў «Палесдруку» ў выкананьні пяцігодкі за два з паловай гады, прэзыдыум ЦВК БССР пастанаўляе:

1. Узнагародзіць «Палесдрук» ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцягу БССР.

2. Выдаць ганаровыя граматы прэзыдыуму ЦВК БССР лепшым ударнікам «Палесдруку»:

Тав. Прохіну А. С., мэханіку-рабочаму — вытворчы стаж 25 год; тав. Пераплётчыкаву Б. І.—рабочаму-наборшчыку, вытворчы стаж — 21 год; т. Прэйдман Б. Е.—работніцы, лепшаму брыгадзіру ўдарнай брыгады, вытворчы стаж — 5 год; т. Майзлесу Р. М. — рабочаму - лінатыпісту, вытворчы стаж — 11 год; т. Пэўзнэру Я. В. — рабочаму - наборшчыку, зараз намесьніку дырэктара, вытворчы стаж — 20 год, т. Рабіновічу З. М. — рабочаму друкару, зараз дырэктару «Палесдруку», вытворчы стаж — 24 гады; т. Пільціенка Пятрусю — рабочаму-сьлесару, вынаходніку, вытворчы стаж — 18 год.

3. Даручыць ВСНГ БССР вылучыць неабходныя сродкі для паляпшэньня сацыяльна-бытавых умоў рабочых і інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу калектыву «Палесдруку», а таксама для прэміяваньня лепшых ударнікаў.

Старшыня ЦВК БССР — А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар ЦВК БССР — М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

МЕНСКАЯ ШПАЛЕРНАЯ ФАБРЫКА ВЫКАНАЛА ПЯЦІГОДКУ ЗА 3 ГАДЫ

ПАСТАНОВА ПРЭЗЫДЫУМУ ЦВК БССР

НА АСНОВЕ ПРАВІЛЬНАГА АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЯ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ, ВЫРАЗНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ, ВЯЛІКАГА ВЫТВОРЧАГА ЗДЫМУ РАБОЧЫХ І СПЭЦЫЯЛІСТАЎ, РАЗГОРТВАНЬНЯ САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА, ШПАЛЕРНАЯ ФАБРЫКА ІМЯ ВАРОЎСКАГА Ў ГОРАДЗЕ МЕНСКУ ВЫКАНАЛА ПЯЦІГОДКУ ЗА ТРЫ ГАДЫ.

АДЗНАЧАЮЧЫ ГЭТЫЯ ПОСЬПЕХІ, ПРЭЗЫДЫУМ ЦВК БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. ВЫДАЦЬ ШПАЛЕРНАЙ ФАБРЫЦЫ ІМЯ ВАРОЎСКАГА ГАНАРОВУЮ ГРАМАТУ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦВК БССР.

2. ВЫДАЦЬ ГАНАРОВЫЯ ГРАМАТЫ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦВК БССР НАСТУПНЫМ ЛЕПШЫМ УДАРНІКАМ ШПАЛЕРНАЙ ФАБРЫКІ:

КРАСНАСЕЛЬСКАМУ Я. Г., РАБОЧАМУ, ВЫЛУЧАНАМУ Ў МАІ 1931 Г. ДЫРЭКТАРАМ ФАБРЫКІ; ЛУЦУКУ Б. Г., МЭХАНІКУ ФАБРЫКІ, ВЫТВОРЧЫ СТАЖ 35 ГОД; БАГДАНОВІЧУ Х. М. — СТАРЭЙШАМУ РАБОЧАМУ ФАБРЫКІ І БРЫСЭВІЧУ АЛЕСЮ, — РАБОЧАМУ ВЫЛУЧОНЦУ, МАЙСТРУ ФАБРЫКІ.

3. ДАРУЧЫЦЬ ВСНГ БССР ВЫЛУЧЫЦЬ НЕАБХОДНЫЯ СРОДКІ ДЛЯ ПАЛЯПШЭНЬНЯ САЦЫЯЛЬНА - БЫТАВЫХ УМОЎ РАБОЧЫХ І ІНЖЫНЭРНА - ТЭХНІЧНАГА ПЭРСАНАЛУ КАЛЕКТЫВУ ШПАЛЕРНАЙ ФАБРЫКІ, А ТАКСАМА ДЛЯ ПРЭМІЯВАНЬНЯ ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ.

Старшыня ЦВК БССР — А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар ЦВК БССР — М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

Арганізатар і кіраўнік шавейнай прамысловасьці БССР

ТЭКЛІН Г. Ю. Старэйшы прафэсыянальны работнік БССР. З 1919 г. працаваў сакратаром, а потым старшынёй цэнтральнага праўленьня саюзу швейнікаў Беларусі. Рабочы, вытворчы стаж 22 гады. Актыўна працаваў на гаспадарчай рабоце — быў дырэктарам Гомельскай швейнай фабрыкі «Камінтэрн». Адзін з актыўнейшых арганізатараў швейнай прамысловасьці БССР.

Зараз член прэзыдыуму ЦП саюзу швейнікаў, кіраўнік Белшвейаб'яднаньня.

Узнагароды работнікам швейнай прамысловасьці

У дадатак да сваёй пастановы ад 25 лістапада 1931 году аб узнагародзе некаторых работнікаў швейнай прамысловасьці ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцягу БССР прэзыдыум ЦВК БССР пастанавіў:

Узнагародзіць ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцягу БССР т. т. ЛЕВІНА і ТЭКЛІНА.

АКТЫЎНЫ РАЦЫЯНАЛІЗАТАР, НЯСТОМНЫ УДАРНІК

ЛЕВІН МАЙСЕЙ МОРДУХАЎ — РАБОЧЫ ФАБРЫКІ «КАСТРЫЧНІК». ВЫТВОРЧЫ СТАЖ — 17 ГОД. СЛУЖЫЎ У ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

НА ФАБРЫЦЫ «КАСТРЫЧНІК» ПРАЦАВАЎ САКРАТАРОМ ПАРТЫЙНАЙ ЯЧЭЙКІ. СТАРШЫНЁЮ ФАВКОМУ.

ВЫЛУЧАН НАМЕСЬНІКАМ ДЫРЭКТАРА ПА ПРАЦЫ Ў БЕЛШВЭАБ'ЯДНАНЬНІ, ДЗЕ ПРАЦУЕ І ЗАРАЗ ЧЛЕН ПАРТЫІ З 1924 ГОДУ.

ПРЫМАЎ АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ У АРГАНІЗАЦЫІ ШВЭЙНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ БССР І АСАБЛІВА ФАБРЫКІ «КАСТРЫЧНІК».

У 1929 Г. ЗА КАШТОЎНЫЯ РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІЯ ПРАНАВОВЫ ПРЭМІЯВАНЫ.

Стварэньне мэханізаванай малочнай прамысловасьці БССР—чэрговая задача*)

Малако і малочныя прадукты займаюць значнае месца ў бюджэце шырокіх працоўных мас. Аб тым, што яны зьяўляюцца высокакаляснымі прадуктамі харчаваньня сьведчыць хаця-б наступныя некалькі прыкладаў. Адзін кілёграм галяндзкага сыру калёрыйнасьці заміняе 3 кілёграмы яек, або 48 кгр. бульбы, 8,5 гр. яблык, 2 кгр. мяса, і г. д.

Па БССР ў 1928 годзе на душу насельніцтва прыпадала 163 кгр. малака. З таго часу спажываньне малака працоўнымі, дзякуючы бязупынаму росту іх матар'яльнага дабрабыту, значна павялічылася. У 1930 годзе на аднаго рабочага ў Савецкай Беларусі прыпадала ўжо 180 кілёграм, а ў 1931 годзе — 200 кілёграм. Зусім процілеглае зьявішча за апошнія гады назіраецца ў капіталістычных краінах.

Перад намі стаіць задача дагнаць і перагнаць нормы спажываньня капіталістычных краін у першыя-ж гады другой пяцігодкі; поўнасьцю задаволіць надзвычай узросшую патрэбнасьць шырокіх працоўных мас гораду і вёскі ў малочных прадуктах.

Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі, мерапрыемствы партыі па разьвіцьці жывёлагадоўлі забясьпечваюць выкананьне гэтых задач.

Індустрыялізацыя, электрыфікацыя краіны, шырокая сетка МТС падводзіць над разьвіцьцё малочнай прамысловасьці патрэбную мэханічную базу. БССР набілася вялізарных посьпехаў у галіне энэргетыкі, ёсьць пэўныя дасягненьні ў рэканструкцыі малочных заводаў. Аднак, гэтыя посьпехі зусім невыстарчальныя.

Існуючыя малочныя заводы (значная частка іх—саматужныя) ня могуць справіцца з пераапрацоўкай усёй наяўнай колькасьці малака. Стварэньне буйной мэханізаванай малочнай прамысловасьці, — чарговая задача дня.

Малочная прамысловасьць зьяўляецца вядучай у разьвіцьці жывёлагадоўлі, бо яна вядзе да глыбокіх рэканструкцыйных зрухаў у гэтай галіне сельскай гаспадаркі. Гэта добра ўлічвала прышчэпаўшчына, якая ўсім мерамі імкнулася сарваць разгортваньне малочнай вытворчасьці і трымала курс на пабудову саматужных дробных маслазаводаў, разьлічаных на пераапрацоўку таварнай прадукцыі дробных сялянскіх гаспадарак. У пачатку мая 1929 году былое прышчэпаўскае кіраўніцтва Наркамзему пастанавіла: «Лічыць нямэтазгодным пабудову мэханізаваных заводаў у БССР». Усяляк тармазілі будаўніцтва малочнай прамысловасьці шкоднікі з кандрацьеўскай і чаянаўскай контр-рэвалюцыйных арганізацый.

Напоўсаматужныя малочныя заводы нас ні ў якім разе задаволіць ня могуць.

У сувязі з неабходнасьцю будаўніцтва буйных мэханізаваных заводаў, спынімся на практыцы арганізацыі малочных таварных фэрм. Гэта справа ва многіх выпадках зусім ня ўвязваецца з плянам будаўніцтва пераапрацоўчых прадпрыемстваў. Атрымліваецца такое становішча: у радзе месц, там, дзе будуць пабудаваны заводы, фэрм няма, а там, дзе намячаецца пакуль што будаўніцтва пераапрацоўчых прадпрыемстваў, арганізуецца шмат малочных фэрм.

У нас ёсьць зараз 1.000 фэрм. У сярэдзіне на кожную з іх прыпадае каля 70 дойных кароў. Гэта карлікавыя гаспадаркі. Апрача таго, многія з іх няправільна размешчаны. Напрыклад, у Горках ёсьць саўгас, стада якога маркуецца давесьці да 5.000 шт. Скотныя двары будуюцца на адлегласьці паўкілёмэтра адзін ад другога. Як пры такіх умовах мэханізаваць жывёлагадоўлю і колькі такая мэханізацыя будзе каштаваць? Апрача таго, будаўніцтва дробных фэрм распыляе сродкі, не дае магчымасьці сур'ёзна падысьці да пытаньня іх мэханізацыі.

Важнейшым пытаньнем зьяўляецца транспартная праблема. Для перавозкі вялізарнага патоку малака патрэбен вялікі спэцыяльны транспарт. Паколькі ўдзельная вага гужавога транспарту па бліжэйшы час яшчэ будзе вялікай, трэба яго часткова рэканструяваць, шляхам пабудовы спэцыяльных фурманак і пляцформ. Нельга забываць, што ад дрэннай перавозкі гужам на адлегласьці 30 клм., масла на 50 проц. зьнікаецца ахасьцю.

Грунтоўныя мерапрыемствы павінны быць ажыцьцёўлены па лініі ўкараненьня аўтатранспарту, прычым вялікае значэньне набываюць дыстэрны. Перавозка аўтамабілямі—цыстэрнамі пачынае з посьпехам канкураваць з перавозкай малака ў бітонах. Паводле даных амэрыканскай харчовай прамысловасьці, выдаткі па перавозцы ста галёнаў малака па ўтамабілях у бітонах складаюць 3,89 даляраў, а ў аўтацыстэрнах — 2,67 даляраў.

Для рэканструкцыі малочнай прамысловасьці патрэбны кадры. Наркам зем правільна пакінуў да пытаньня падрыхтоўкі спэцыялістаў, арганізаваўшы малочнае адзяленьне пры жывёлагадоўчым інстытуце ў Горках. Гэта адзяленьне будзе выпускаць іх жынэраў-тэхнолёгаў. Але падрыхтоўка кадраў масавых прафэсій з калгасьнікаў і спэцыялістаў сярэдняй кваліфікацыі не наладжана. А гэта значае, што мы ня рыхтуем асноўнага касьцяку работнікаў малочнай вытворчасьці. Такое становішча, калі прыходзіцца навучаць людзей малочнай тэхналёгіі выключна па кніжках, ня можа быць цярпіма. У сьвятле гэтага вытворчая практыка зьяўляецца адзінай з важнейшых умоў падрыхтоўкі добра падкаваных работнікаў.

Высоўваючы пытаньне аб фарсаваным будаўніцтве буйных мэханізаваных малочных заводаў, неабходна адначасова прыняць рашучыя меры да паляпшэньня работы існуючых прадпрыемстваў. Перад навуковымі работнікамі і спэцыялістамі стаіць задача рацыяналізаваць работу гэтых прадпрыемстваў, укараніць тэхніку. У нас ёсьць шмат пытаньняў, якія чакаюць свайго тэхнічнага вырашэньня, паляпшэньня працэсаў вытворчасьці. Даволі прывесьці факт, што галяндзкі сыр высьпявае ў нас у тры з паловаю месяцы, у той час, як пры ўжываньні навейшых тэхнічных працэсаў высьпяваньне можа быць скарочана да паўтара-двух месяцаў. Мы да гэтага часу дакладна ня ведаем, колькі спажывае энэргіі тая ці іншая машына, якая працуе на нашых малочных прадпрыемствах.

Усе закрануты пытаньні могуць быць вырашаны толькі пры ўмове шырокай мабілізацыі грамадзкасьці, і актыўнай работы навуковых працаўнікоў.

*) З выступленьня т. Суёмы на нарадзе пры Наркамземе па пытаньні аб павышэньні ўраджайнасьці і ўзьвышэньні прадукцыйнасьці жывёлы.

М. ДАШКЕВІЧ

Грамадзкае харчаваньне—адно з важнейшых звеньняў сацыялістычнай будоўлі

Партыя і ўрад высунулі грамадзкае харчаваньне ў рад першаступенных вучасткаў нашай будоўлі.

Пасьля пастаноў ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб паляпшэньні грамадзкага харчаваньня прайшло некалькі месяцаў. Тэрмін выстарчальны для таго, каб дабіцца рашучага зруху ў выкананьні дырэктыў партыі і ўраду.

Ці ёсьць такі пералом? Ёсьць, але яўна слабы і дасягнуты толькі на паасобных вучастках, а не па ўсім фронце грамадзкага харчаваньня. Яшчэ вельмі шмат'я рабочыя сталовыя могуць пахваліцца сьвежым абедам, разнастайным мэню, якіх'ацкі ураўнілаўкі ў абслугоўваньні ўдарнікаў і прагульшчыкаў і г. д.

На вучастку грамадзкага харчаваньня ўсё больш і больш пачынае адчуваецца слабасьць тэхнічнай базы. Усё часьцей выкрываюцца факты, калі вузкім месцам у рабоце прадпрыемстваў па грамадзкім харчаваньні зьяўляецца ўжо ня столькі недахват прадуктаў харчаваньня, колькі адсутнасьць здавальняючых памяшканьняў, абсталяваньня і кухоннага інвэнтару. У радзе сталовых БССР не хапае відэльцаў, ложак. Для прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня на 1932 г. не хапае 300.000 сталовых прыкмет. Белкаапхарчу патрэбна 540.000 чыстых прылад і шмат кухоннага абсталяваньня.

ВСНГ і Белсакпрамсаюз ня ўжылі належных захадаў для забясьпячэньня грамадзкага харчаваньня патрэбным абсталяваньнем. ВСНГ БССР ня выканаў дырэктывы аб рэканструкцыі барысаўскага заводу «Чырвоны мэталіст» і спэцыялізацыі яго выключна ў напрамку вырабу абсталяваньня для грамадзкага харчаваньня. Завод «Чырвоны мэталіст», і сыстэма прамкаапэрацыі не згаджаюцца прыняць заказ на важы і відэльцы.

Матар'ялы абсьледваньня ЦКК-НК РСІ сьведчаць аб тым, што дагэтуль няма належнага павароту ўвагі партыйных, савецкіх і прафэсыянальных арганізацый да справы грамадзкага харчаваньня. Мала барацьбы за канкрэтны лёзунг пераўтварэньня сталовых ва ўзоры цэх харчаваньня. Яшчэ не ва ўсіх зьвеньнях партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных і інш. арганізацый зразумелі палітычную важнасьць задач, пастаўленых партыяй у адозьве ЦК УсеКП(б) ад 19 сьнежня і пастанове ЦК КП(б)Б і СНК БССР ад 29 верасьня.

Дагэтуль ня выканана дырэктыва ЦК і СНК БССР аб скарэньні будаўніцтва сталовых на фабрыцы «Кастрычнік» (Менск), «Дзьвіна», «Сьцяг індустрыялізацыі» (Віцебск) і раённай сталоўкі на Ляхаўцы (Менск). Ня скончан таксама рэмонт сталовай у Менску.

Прапускная здольнасьць існуючых сталовых не здавальняе ўзросшых патрэб. Ёсьць рад сталовых, дзе пры прапускной здольнасьці 1.000—1.500 абедаў харчуецца 2.000-2.500. (сталоўка №№ 37 і 69 у Менску).

Паводле пастановы ЦК КП(б)Б, Белдзяржбуд павінен быў скончыць па пудову фабрыкі-кухні да 1 студзеня 1932 году. Але пуск фабрыкі зацягваецца. Вінават у гэтым Белкаапсаюз, які не забясьпечыў акуратнага фінансаваньня, і Белдзяржбуд, які вывез з будаўніцтва фабрыкі-кухні 2 з паловай вагоны цэмэнту, 55.000 штук цэглы, 13 тон вапны і гэтым самым замарудзіў тэмпы будаўніцтва.

Барацьба за якасьць харчаваньня і абслугоўваньне спажыўца не пастаўлены ў цэнтр увагі.

Дзяржаппа са сваіх цэнтралізаваных фондаў адпускае грамадзкаму харчаваньню вялікую колькасьць прадуктаў. Гэтыя фонды нярэдка скарыстоўваюцца неразумна і часамі злачынна разбазарваюцца.

Абсьледваньне ЦКК-НК РСІ менскай сэкцыі грамадзкага харчаваньня паказала, што спасыланьні на адсутнасьць патрэбнай колькасьці прадуктаў—зусім беспадстаўны. Выяўляецца, што сталовыя Менску атрымліваюць прадукты па дутых заяўках і сыстэматычна перарасходуюць вызначаныя нормы. Так, у кастрычніку па тую колькасьць абедаў, якая была фактычна прыгатавана, належала выдаткаваць круп 32.506 кгр., фактычна-ж пайшло 61.718 кгр.; мяса адпаведна— 28.837 кгр. і 64.342 кгр.; хлеба па заводзка-фабрычных сталовых належала выдаткаваць 75.273 кгр., пайшло-ж 135.808 кгр.

Сэкцыя грамадзкага харчаваньня атрымала прадуктаў на трэці квартал з разьліку 4.081.574 блюды, у той час, як фактычна было выдана 3.736.002 блюды. Ня гледзячы на значнае перарасходваньне прадуктаў, калёрыйнасьць абедаў замест нармальных 760 калёрый хістаецца паміж 525—261. Асабліва нізкую калёрыйнасьць паказваюць сталовыя хлебазаводу (269,5 калёрый), абутковай фабрыкі (289,5), заводу «Бальшавік» (327,6) і інш.

Дзённая якасьць і нізкая калёрыйнасьць абедаў у значнай ступені выклікаюцца нездавальняючай апрацоўкай і прыгатаваньнем страў. Вось узор злачынных адносін да грамадзкага харчаваньня (узята з дзеньніка бракеражу пры менскай сэкцыі грамадзкага харчаваньня): у сталоўцы №56—200 порцый другога блюда—пацямнёўшая каўбаса з нярэзанымі шахам; у сталоўцы № 34 праклс суп у колькасьці 100 порцый: у сталоўцы №11 рубленае мяса на падбайнасьці пасаванa тухлымі яйкамі; у сталоўцы № 58 пасаваді 400 супаў дзённай апрацоўкай дроскдкаў, у сталоўцы № 50 перавараи макаронны суп у колькасьці 500 порцый.

Арганізацыя бракеражных камісій праходзіць вельмі марудна. У Менску створаны бракеражныя камісіі толькі пры 8 сталовых.

Дагэтуль у большасьці сталовых зьдзельшчына ня ўведзена. Па Менску з 51 сталоўкі (без ЗРК і ЗВК) на прагрэсыўна-прэміяльную зьдзельшчыну пераведзены толькі дзьве.

Паблюдная сыстэма абедаў ня стала яшчэ асноўнай формай работы сталовых. Многія загатоўкі сталовых упарта супраціўляюцца ўвядзеньню паблюднай сыстэмы, спасылаючыся на розныя «аб'ектыўныя» прычыны — «не хапае прадуктаў», зусім забываючы, што ёсьць шырокая магчымасьць здабываць дадатковыя рэсурсы прадуктаў харчаваньня шляхам разгортваньня самазагатовак і арганізацыі дапаможных прадпрыемстваў.

Самазагатоўкі і адкормачныя апэрацыі пры сталовых зьяўляюцца асноўным сродкам паляпшэньня грамадзкага харчаваньня на бліжэйшы час. Белкаапхарч і Наркамснаб, згодна пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР, у пяцідзённы тэрмін павінны былі ўстанавіць парадак і раёны загатовак для патрэб грамадзкага харчаваньня, даўшы сталовым права заключэньня дагавораў з калгасамі і саўгасамі.

Гэта дырэктыва выканана са значным спазьненьнем. Вынікі работы па самазагатоўках пакуль што нязначныя. Сэкцыя грамадзкага харчаваньня, работнікі сталовых у гэтай галіне не праяўляюць ініцыятывы і паваротлівасьці.

Слаба разгортваецца работа па арганізацыі пры сталовых дапаможных прадпрыемстваў. Паводле даных Белкаапхарч

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

З БАЛЬШАВІЦКАЙ НЕПРЫМІРЫМАСЬЦЮ ЗМАГАЦЦА

супроць трацкісцкай кантрабанды, супроць гнілога лібэралізму

За ваяўнічую партыйнасьць у тэорыі

(Рэзалюцыя нарады сакратароў парткалектываў і ячэек КП(б)Б Менскай арганізацыі)

Нарада сакратароў парткалектываў і ячэек КП(б)Б Менскай арганізацыі канстатуе, што ліст тав. СТАЛІНА ў рэдакцыю часопісі «ПРОЛЕТАРСКАЯ РЕВОЛЮЦИЯ» — «Аб некаторых пытаньнях гісторыі бальшавізму» мае важнейшае тэарытычнае і палітычнае значэньне для ўсяго тэарытычнага фронту, для ўсёй партыі і міжнароднага рэвалюцыйнага руху.

Ліст тав СТАЛІНА ўзьнімае на вялікарную вышыню асноўныя пытаньні гісторыі бальшавізму і на прыкладзе трацкісцкай кантрабанды «Слуцкіх» і «Валасевічаў» выкрывае новыя, замаскаваныя формы вылазак трацкізму, гэтага перадавога атраду контр-рэвалюцыйнай буржуазіі, супроць партыі і ленінізму, новы манэўр трацкістаў, якія прабуюць скарыстаць гнілы лібэралізм некаторых партыйцаў для нападу на партыю і ленінізм. Трацкісты прабуюць весьці барацьбу супроць бальшавізму — ленінізму шляхам фальсыфікацыі гісторыі бальшавізму, шляхам адмаўленьня сусьветнай ролі бальшавізму і яго кіраўніцтва міжнароднай пралетарскай рэвалюцыяй і непрымірымай барацьбы яго з усімі відамі апартунізму і прымірэнцтвам — на працягу ўсяго існаваньня бальшавіцкай партыі.

Ліст тав. СТАЛІНА выкрывае спробы рэнэгатаў марксызму - ленінізму прадставіць поўцэнтрысцкі сьцяг люксэмбургізма, як сапраўднае марксыцкае вучэньне і, выкарыстоўваючы рэвалюцыйныя заслугі Розы Люксэмбург, адцягнуць масы пралетарыяту на Захадзе ад бальшавіцкага кіраўніцтва Камінтэрну, ад пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва СССР. Ліст тв. СТАЛІНА рашуча патрабуе ад кожнага бальшавіка сугуба прынцыповых партыйных адносін да ўсіх тэарытычных пытаньняў і перш за ўсё да пытаньняў гісторыі бальшавізму. Адгэтуль увага усёй партыі і тэарытычных кадраў павінна быць сканцэнтравана на бальшавіцкай крытыцы і выпраўленьні памылак, якія льлюць ваду на млын трацкізму і маюць месца ў работах бальшавіцкіх гісторыкаў. Зусім правільным указаньнем тав. СТАЛІНА ў гэтых адносінах зьяўляецца ўказаньне на рад памылак прынцыповага і гістарычнага парадку ў працах па гісторыі УсеКП(б) пад рэдакцыяй тав. ЯРАСЛАЎСКАГА.

Пастаўленыя задачы тав. СТАЛІНЫМ патрабуюць ад усіх партыйных арганізацый узмацненьня базьлітаснай барацьбы за партыйнасьць у рабоце супроць усялякіх праяўленьняў контр-рэвалюцыйнага трацкізму, апартунізму і прымірэнцтва да яго, як у тэорыі, так і на практыцы, узмацненьне бальшавіцкай пільнасьці і змаганьня з гнілым лібэралізмам.

Нарада сакратароў парткалектываў і ячэек КП(б)Б лічыць, што нездавальняюча разгортваецца пра працоў ка ліста т. Сталіна і не з усёй рашучасьцю ўскрываюцца скажэньні, мёртвыя месцы на тэарытычным фронце БССР.

Нарада сакратароў парткалектываў і ячэек КП(б)Б Менскай арганізацыі звяртае ўвагу тэарытычнага фронту Беларусі і ў прыватнасьці Інстытут Гісторыі Партыі і Рэвруху на тое, што ў БССР яшчэ да гэтага часу амаль няма літаратуры і падручнікаў па гісторыі КП(б)Б, якія б правільна асьвятлялі гісторыю бальшавізму і Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі і гэта у той час, калі да гэтага часу яшчэ працягваюцца ў літаратуру трацкісцкая кантрабанда, вялікадзяржаўніцкія, нацдэмаўскія тэорыі, як напрыклад: аб дзьвёхкарэннасьці КП(б)Б; аб Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі, як рэвалюцыі сялянскай; ідэалізацыя дробна-буржуазных нацыяналістычных партый (Бунд, БГС і г. д.); супроцьстаўленьне КП(б)Б — УсеКП(б) і БССР—РСФСР; тлумачэньне ўсяго дарэвалюцыйнага, нацыянальнага руху як контр-рэвалюцыйнага і г. д. Кнігі, якія ёсьць па гісторыі КП(б)Б і Кастрычніцкай рэвалюцыі маюць рад буйнейшых, як трацкісцкіх, так вялікадзяржаўных і нац-дэмаўскіх памылак (работы Агурскага, Майзэля-Шапавалава, Шчарбакова), якія да апошняга часу ня былі шырока па-бальшавіцку раскрытыкаваны і сёе-якіх ня быў ускрыт перад партыйнай арганізацыяй і шырокімі рабочымі і калгаснымі масамі. Нарада катэгарычна патрабуе ад камуністаў, што працуюць на тэарытычным фронце, рашучага выкрыцьця і бальшавіцкай крытыкі прарываў і нехапоў на тэарытычным фронце ў БССР.

Нарада падкрэсьлівае зусім недастатковую работу марксыцкіх навуковых таварыстваў у барацьбе з антыленінскімі ўстаноўкамі ў навуковых работах, у нацыянальным пытаньні, і асабліва ў барацьбе з праяўленьнямі вялікадзяржаўнага шавінізму.

Нарада канстатуе замкнутасьць у рабоце марксыцкіх таварыстваў і адсутнасьць масавай работы сярод рабочых. Неабходна рашуча перабудаваць дзейнасьць марксыцкіх таварыстваў у напрамку большай палітычнай пільнасьці, змаганьня з усялякімі праяўленьнямі гнілога лібэралізму ў адносінах да трацкісцкай кантрабанды і ўсялякага праяўленьня варожых нам тэорый, супроць скрыўленьня нацыянальнай палітыкі, асабліва супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, супроць контр-рэвалюцыйнага нац.-дэмакратызму і шавінізмаў розных колераў, за разгортваньне масавай работы на прадпрыемствах, сярод настаўніцтва, студэнцтва і г. д.

Нарада канстатуе, што навуковая праца тав. ЮГАВА («Саветы ў першыя дні Рэвалюцыі») наскрозь прасякнута трацкісцкімі ўстаноўкамі, пры чым тав. ЮГАЎ не разгарнуў крытыкі сваіх трацкісцкіх установак у навуковых працах, а наадварот, сваім выступленьнем на нарадзе спра бавав абыйсьці сутнасьць гэтых памылак.

Нарада сакратароў рашуча патрабуе ад тав. ВАЛЬФСОНА і ВЫДРЫ даць разгорнутую крытыку дапушчаных імі буйнейшых палітычных памылак у нацыянальным пытаньні, якія (памылкі) інакш ня могуць быць кваліфікаваны, як ухіл у бок вялікадзяржаўнага шавінізму.

Нарада канстатуе што ў тэарытычнай рабоце тав. РЫЎЛІНА маецца палітычна-шкодная памылка ў ацэнцы маладых у гэрманскай сацыял-дэмакратыі. Гэтая работа да апошняга часу ня была па-бальшавіцку раскрытыкавана з прычыны чаго нарада патрабуе ад тав. РЫЎЛІНА найхутчэйшага выпраўленьня і крытыкі зробленай ім памылкі.

Нарада сакратароў таксама патрабуе і ад тав. ШЧАРБАКОВА разгорнутай крытыкі нацыянал-дэмакратычных памылак у яго рабоце аб Кастрычніку на Беларусі.

Ліст тав. СТАЛІНА з асаблівай сілай падкрэсьлівае значэньне марксыцка-ленінскага выхаваньня членаў партыі і камсамольцаў у барацьбе за правядзеньне генэральнай лініі партыі.

Ад кожнай партыйнай ячэйкі і кожнага члена партыі нарада патрабуе ўзмацненьня барацьбы з усялякімі праяўленьнямі трацкізму, апартунізмам і прымірэнцтвам да іх як у тэорыі, так і на практыцы, рашучай барацьбы супроць усялякіх скрыўленьняў нацыянальнай палітыкі нашай партыі.

Перад парт арганізацыяй у сувязі з гэтым стаіць задача тэрмінова ліквідаваць буйныя прарывы ў настаноўцы партыйнай асьветы, шляхам праверкі на працягу дэкады работы школ, як з боку зьместу, так і з боку ахопу школамі партыйнай вучобай членаў партыі і камсамольцаў і фактычнага наведваньня іх.

Нарада лічыць неабходным прапрацаваць на агульных сходах ячэек ліст тав. СТАЛІНА і вызначыць канкрэтныя задачы, якія выплываюць з яго для кожнай ячэйкі, а таксама прапрацаваць гэты ліст ва ўсёй сыстэме партыйнай асьветы.

Разважаньні „наогул" і „канкрэтнасьць" Мірука

Зьмяшчаючы рэзалюцыю сходу парткалектыву Канвузу аб лісьце тав. Сталіна ў часопісь «Пролетарская революция», «Зьвязда» завастрыла ўвагу партарганізацый на необходнасьці выкрываць канкрэтных асоб, якія дапускалі памылкі ў сваёй рабоце, прымірэнча адносіліся да спроб апартуністычных элемэнтаў скажаць лінію партыі і фальсыфікаваць гісторыю бальшавізму.

Трэба сказаць, што гэтай задачы ня ўлічылі яшчэ паасобныя парт'ячэйкі. Абмеркаваньне ліста т. Сталіна на партсходзе друкарні імя Сталіна насіла агульны характар. У складзе парткалектыву друкарні знаходзіцца партячэйка ДВБ. Як вядома, у рабоце ДВБ было шмат памылак, якія заключаліся ў выданьні ідэалёгічна варожай літаратуры з яўнымі антыпартыйнымі ўстаноўкамі. Адзак, выступаўшыя ў спрэчках работнікі ДВБ ня ўвязвалі абмеркаваньня ліста тав. Сталіна з крытыкай памылак, яны гаварылі «наогул» аб многім, толькі не аб памылках свайго выдавецтва.

Праўда, гэтаму пытаньню прысьвяцілі М. Горкага (рабфак і інш.).

Гэтыя клясава-варожыя вылазкі не атрымлівалі своечасова належнага адпору. Бюро парткалектыву не мабілізавала грамадзкасьці навучальнай установы на барацьбу з носьбітамі варожай ідэалёгіі, з адступленьнямі і скажэньнямі марксыцка - ленінскай мэтадалёгіі.

Новавыбранае бюро партыйнага калектыву павінна ўлічыць памылкі ранейшага парткіраўніцтва інстытуту, вічыльней падысьці да пытаньняў кіраўніцтва акадэмічнай работай установы, мабілізаваць грамадзкасьць на барацьбу за партыйнасьць у навуцы, за аўладаньне марксыцка-ленінскай мэтадалёгіяй, супроць спроб правых і «левых» апартуністаў скажаць лінію партыі, супроць трацкісцка-кантрабандысцкіх спроб рэвізаваць вучэньне Маркса-Леніна і фальсыфікаваць гісторыю бальшавізму. Трэба рашуча выкрываць і вытручваць гнілы лібэралізм, прымірэнцтва да апартунізму.

Выкрываць носьбітаў варожай ідэалёгіі

Барацьба за партыйнасьць у навуцы павінна быць пакладзена ў аснову работы кожнай партыйнай арганізацыі навучальных устаноў. Гэтай задачы не ўсьвядоміла партыйнае кіраўніцтва будаўнічага інстытуту.

На перавыбарчым сходзе парткалектыву выявілася, што партыйная арганізацыя інстытуту не перабудавала сваёй работы па-новаму, не забясьпечыла сваім кіраўніцтвам пасьпяховай работы ўсіх зьвеньняў навучальнай установы. Бюро парткалектыву мала адвяла ўвагі выкананьню навучальных праграм, ня цікавілася іх зьместам і праламленьнем іх у практычнай рабоце.

За апошні год у будаўнічым інстытуце мелі месца спробы рэвізаваць марксыцка-ленінскую мэтадалёгію ў выкладаньні сацыяльна-эканамічных і фізыка-матэматычных навук, праяўленьні ідэалізму, элемэнты пераверзеўшчыны ў выкладаньні літаратуры, грубыя скажэньні ў ацэнцы творчасьці сваю прамову Марук (выключаны з партыі за нацыянал-апартунізм). Але, як? Марук тлумачыў памылкі ў рабоце ДВБ перагрузкай работнікаў, паасобнымі выпадкамі нядбайнасьці і прычынамі малапісьменнасьці.

Выпукваньнем «аб'ектыўных» прычын, сьвядомым спрашчэньнем у характарыстыцы памылак ДВБ Марук імкнуўся затушаваць тую контр-рэвалюцыйную дзейнасьць, якую праводзілі нацызмы, прабраўшыся на кіруючую работу ў некаторыя ўстановы, у тым ліку і ў ДВБ і гнілы лібэралізм некаторых камуністаў да антыпартыйных установак.

Характэрна, што спробам Марука выпусташыць палітычную сутнасьць пытаньня ніхто з удзельнікаў сходу ня даў адпору. Нават дакладчык у заключным слове не завастрыў увагі на сутнасьці яго выступленьня.

Перэзагаваньне на такія выступленьні зьяўляецца палітычнай памылкай, гнілым лібэралізмам, на задачах узмацненьня барацьбы з якім асабліва завострана ўвага ў лісьце тав. Сталіна.

М. Мільхман.

Трацкісцкім фальсыфікатарам ня месца ў радах партыі

МАСЛЯВА. Апартуністы-трацкісцкія фальсыфікатары прабуюць прасякнуць у кузьніцу бальшавіцкіх кадраў — ГПП. Загадчык газэтна-рэдакторскага аддзяленьня, кіраўнік сэмінару Закс Гладнёў, былы актыўны ўдзельнік трацкісцка-зіноўеўскай апазыцыі ў адной сваёй лекцыі праводзіў трацкісцка-зіноўеўскія погляды аб «чыста расійскім» значэньні ленінізму і зьвёў ролю Леніна да ролі «расійскага» тлумача марксызму. Ленін яшчэ ў першых пісьмах ім фабрычна-заводзкіх лістках, а потым газэтах «Іскра», «Вперед» змагаўся за партыйнасьць друку. Гладнёў сьцьвярджаў, што газэты бальшавіцкай партыі былі ў вядомы пэрыяд непартыйнымі. Апрача таго, Гладнёў замаскавана прабаваў паставіць пад сумненьне кіруючую ролю правадыра партыі тав. Сталіна, зусім замаўчваючы ролю тав. Сталіна, як правадыра і тэаретыка партыі і Камінтэрну.

Выкрыты сэмінарам, рэзка раскрытыкаваны, Гладнёў толькі фарыфальна прызнаў дапушчаныя ім трацкісцка-меншавіцкія памылкі.

Бюро ячэйкі, разабраўшы справу Гладнёва, прызнала далейшае знаходжаньне яго ў партыі немагчымым і паставіла перад РКК пытаньне аб выключэньні яго з партыі.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Насеннаводчыя раёны павінны выканаць свае абавязкі перад дзяржавай

Пасевы кармовых траў забясьпечыць мясцовым насеньнем

Усё яшчэ забаўляюцца дырэктывамі

ПРАПОЙСК. Яшчэ 1-га кастрычніка РВК абавязаў райземчастку давесьці планы загатовак насеньня кармовых траў да сельсаветаў, паселішч, калгасаў і даць пьвёрдыя заданьні кулацка-заможным гаспадаркам.

Але справа далей пастановы не пашла. Толькі 3-га сьнежня РВК даў дырэктыву сельсаветам аб разгортваньні загатовак насеньня, а плянаў і да сёнешняга дня ў сельсаветы ня спусьціў. Адзіным загатоўшчыкам у рёне зьяўляецца райкаапсаюз, які гэтым пытаньнем да апошняга часу амаль не займаўся.

Некаторыя работнікі раёну лічаць, што плян загатоўкі насеньня траў нерэальны, у выніку плян загатовак насеньня траў па Прапойскім раёне — пад пагрозай зрыву. На сёнешні дзень не загатоўлена ні аднаго кілё.

Я. С.

Паперкі замест насеньня

КАПЫЛЬ. (Наш кар.). На 8 сьнежня загатоўкі насеньня траў па Капыльскім раёне яшчэ не распачыналіся. Загадчык насенканторы Кулеш ня прыняў ніякіх мер да своечасовай здачы насеньня і, выяжджаючы на раён, не арганізаваў загатовак па мясцох. Насеньне, якое павінна было паступіць ад калгасу на склад насенканторы, пакінута ў калгасах, пад захавальныя расьпіскі, што па становай Белканторы Насентрэсту забараняецца.

МТС не прыступіла да абмалоту насеньня канюшыны ў калгасах, якія абслугоўваюцца ёю. У калгасе імя Ланцуцкага ёсьць больш 20 вазоў неабмалочанай насеннай канюшыны. У некаторай часткі калгаснікаў ёсьць думка даваць коням неабмалочаную канюшыну, як лепшы корм.

За бязьдзейнасьць і зрыў загатовак насеньня справа насенканторы накіравана пракурору.

Капыльская МТС неадкладна павінна арганізаваць абмалот канюшыны ў калгасах, якія ёю абслугоўваюцца.

В.

Яшчэ не абмалацілі

КОЙДАНАВА (Наш кар.). Саўгас «Самуэлевая» злачынна зрывае кампанію загатоўкі насеньня кармовых траў. У саўгасе ляжыць неабмалочаным ураджай насеннай вікі з 11 га, канюшыны—з 5 га.

Такое ганебнае зацягваньне малацьбы ў саўгасе тлумачыцца поўнай адсутнасьцю прадуўнай дысцыпліны сярод рабочых, адсутнасьцю зьвязьлішчыны, сацыяборніцтва і ўдарніцтва. Трыкутнік саўгасу ня здолеў арганізаваць рабочых на пасьпяховае сканчэньне малацьбы. Ня гледзячы на тое, што ў саўгасе налічваецца 46 штатных рабочых, штодзенна на працу выходзіць ня больш 40. Прагулы сярод рабочых—звычайнае зьявішча.

Рабачком у асобе тав. Захаровіча пінкай барацьбы супроць прагулаў не вядзе. Ужо больш тыдня стаіць сапсаваны саўгасны трактар з-за адсутнасьці якога спынена малацьба. Дырэктар саўгасу тав. Гартвік ня прымае ніякіх захадаў, каб адрамантаваць трактар і хутчэй скончыць малацьбу.

Такое становішча з загатоўкай насеньня далей нецярпіма. На працягу бліжэйшых дзён саўгас павінен скончыць малацьбу і выканаць плян загатовак.

М. Н.

Калі-ж пачне работу Буда-Кашалёўская насенканторы

БУДА-КАШАЛЁЎСКАЯ. (Наш спэцкар.). Бязьдзейнасьць райканторы Белкалгаснасенсаюзу ў рёне ставіць пад пагрозу выкананьне пляну загатовак насеньня шматгадовых траў і гародніны.

На 19-га сьнежня загатоўлена толькі 55 кгр. канюшыны, у той час, як па пляне трэба загатовіць 107,6 цэнтн., вікі загатоўлена 170 цэнтн.—27 проц., буракоў кармовых—10 проц. да пляновага заданьня. Буракоў сталовых і насеньня лугавых траў не загатоўлена ні аднаго кілё.

Насенкантора абмежавалася рассылкай плянаў у сельсаветы. На гэтым работа спынілася.

Гэта дало магчымасьць праўленьням асобных калгасаў не праяўляць ніякай рупліваасьці да загатовак насеньня.

Так, калгас «Камінтэрн», Будалішчанскага сельсавету, паводле кантрактацыйнага договару павінен зрваць 4,8 цэнтн. насеньня канюшыны, 14,4 цэнтн. насеньня кармовых буракоў і 11,2 цэнтн. насеньня сталовых буракоў, але на сёнешні дзень

З. Палякоўскі

У БАРАЦЬБЕ ЗА ВЫСОКІЯ ТЭМПЫ РАБОТЫ ТРАНСПАРТУ

(Вынікі перавыбараў нізавых партзьвеньняў 5-га эксплёатацыйнага раёну)

Вялізарнае значэньне перавыбараў партыйных арганізацый 5-га эксплёатацыйнага раёну Заходніх чыг., якія закончыліся, вызначаецца новымі ўмовамі, новай абстаноўкай, патрабуючай уменьня працаваць па-новаму, узьнімаючы масы чыгуначнікаў на барацьбу за выкананьне задач, пастаўленых партыяй перад транспартам.

Падрыхтоўчая работа да перавыбараў партыйных арганізацый была ператорвана ў масавую грамадзка-палітычную праверку работы ячэек, партыйных груп, парторгаў. Па ўсіх ячэйках былі арганізаваны самаправерачныя добраахвотныя брыгады з прыцягненьнем масы членаў партыі да іх работы. Напрыклад, ячэйкай паравозьнікаў гомельскага дэпо было створана 10 самаправерачных брыгад, ячэйкай вагоннага цэху гэтага-ж дэпо—5 брыгад, па парткалектыве руху (Гомель) працавалі 7 самаправерачных брыгад і г. д.

Уся самаправерачная работа ў ячэйках праходзіла пад кутом праверкі выкананьня пасьці ўмоў тав. Сталіна, перапрыемстваў, якія наметаны пры прапрацоўцы пастаноў кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б) і лістападаўскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, пад знакам мабілізацыі партыйных мас на далейшае набліжэньне партыйных арганізацый да вытворчых адзінак, на разгортваньне ўзаемнай праверкі работы партыйных груп, партыйных арганізатараў, па зьвенах, брыгадах, арцелях, паравозах.

Перавыбары выявілі лепшыя ўзоры работы партыйных груп, партарганізатараў. Партыйная група тав. Жаўына—дышлавой брыгады і партыйная група мэханічнага аддзяленьня т. Платонава — старога дэпо (Гомель) даюць станоўчыя вынікі ў сваёй рабоце. Гэтыя партыйныя групы дабіліся, што ў сваіх брыгадах у кастрычніку ні молі ні аднаго выпадку паўторнага рамонту. Зараз яны зьвялілі прастой паравозаў у абточцы з 10-ці да 3-4 гадзін. Гэтыя посьпехі дасягнуты праз сапраўднае правядзеньне партыйна-масавай работы, лепшымі ўзорамі работы камуністаў, ліквідацыяй абязьлічкі і ўраўнілаўкі, рашучай барацьбай з парушэньнямі працоўнай дысцыпліны.

Партгрупа брыгады паравоза С-331 гомельскага дэпо рэгулярна пасьля кожнай паездкі праводзіць нарады, на якіх падводзіць вынікі работы паравоза, вывучае яго паасобныя дэфэкты. Гэта брыгада паставіла перад сабой задачу вывучыць работу паравоза і ўзяла на сябе абавязацельства зьнішчаць дробныя дэфэкты сваімі сіламі. Брыгадай былі пераглядзяны клапаны на паравозе, што ў значнай ступені дало магчымасьць дабіцца эканоміі змазачных матар'ялаў. Усю работу брыгада праводзіць пад кіраўніцтвам партарганізатара тав. Кандыба.

Ёсьць некаторыя станоўчыя вынікі і ў работе зьменных партыйных арганізатараў. У ячэйцы руху Гомель-пасажырская) партарганізатар 4-ай зьмены тав Цурбанаў разгарнуў масавую работу па ўзмацненьні працоўнай дысцыпліны. У гэтай зьмене ў сацспаборніцтва і ўдарніцтва ўцягнуты ўсе рабочыя. Па ініцыятыве партарганізатара праведзена работа па павышэньні палітычнага і тэхнічнага ўзроўню рабочых, 17 чалавек беспартыйных рабочых гэтай зьмены наведваюць палітшколы і тэхнічныя гурткі.

У гэтай зьмене дасягнута значнае скарачэньне выпадкаў парушэньня працдысцыпліны, у зьмене ліквідавана абязьлічка, кожнаму работніку прыпісана для абслугоўваньня пэўная група стрэлак, сыгнальных прылад і інш.

У ячэйцы вагоннага цэху (Гомель) партарганізатар брыгады аглядаль шчыкаў тав. Літвіненка разам з брыгадзірамі і прафупаўнаважаным дабіліся ўзорнай працоўнай дысцыпліны ў сваёй брыгадзе.

У брыгадзе здавальняюча пастаўлена наведваньне вучобы, усе члены брыгады прымаюць актыўны ўдзел у правядзеньні розных кампаній. Гэта асабліва ярка выявілася пры правядзеньні штурму па рэвізіі буксаў, дзе брыгада зьявілася першай і ўзначаліла гэту работу.

Групай тав. Абыхода абгаворваўся рад канкрэтных мерапрыемстваў, накіраваных на ўзьнімцьце працдысцыпліны і правільную расстаноўку рабочых на кваліфікацыі. У аднаго з рабочых гэтай брыгады тав. Табанькова была слабая інтэнсіўнасьць працы, манкіраваньне работай і г. д. Група, абгаворваючы паводзіны Табанькова на сваім сходзе, напярэдзіла яго, што ў выпадку, калі ён ня справіцца, будзе выведзен са складу гэтай брыгады. Група ўзяла яго пад свой кантроль, і зараз тав. Табанькоў у брыгадзе працуе ня дрэнна. Таксама група рэагавала на няправільную дзейнасьць мацнёра Шыкелі, якая выявілася ў нялюбелай расстаноўцы рабочых на рамонце паравозаў №№ 298, 3125, з-за чаго гэтыя брыгады сталі ў прамыўцы больш вызначанага часу.

Наогул барацьба за своечасовы рамонт паравозаў стаіць у цэнтры ўвагі работы гэтай групы.

Побач з гэтым справаздачна-перавыбарчая кампанія ўскрыла рад адмоўных момантаў у рабоце нізавых партзьвеньняў. Партыйная група тав. Лехмана — кандуктарская рэзэрву (Гомель) перад сабой ніякіх канкрэтных задач ня ставіла. Ня гледзячы на тое, што ў брыгадзе мелі месца сьпазьненьні на работу, прагулы і г. д., гэтымі пытаньнямі партыйная група не займалася. Папуе абязьлічка, а партыйная група не вядзе ніякай барацьбы, каб яе ліквідаваць, не рэагуе на пытаньні, якія ўзьнікаюць у працэсе работы.

Праверка работы нізавых партыйных зьвеньняў паказала, што парткомы, парткалектывы і ячэйкі невыстарчальна выконваюць пастановы ЦК УсеКП(б) ад 21-га красавіка аб партыйна-масавай рабоце ў цэху і брыгадзе. У радзе месц адсутнічала сыстэматычная дапамога і інструктаваньне з боку парткомаў і парткалектываў у рабоце партыйных груп і партыйных арганізатараў. Разгортваньню партыйна-масавай работы ў цэху, брыгадзе, арцелі на паравозе не аддавалася выстарчальнай увагі. Лепшыя ўзоры работы нізавых зьвеньняў не папулярызаваліся. У выніку гэтага, ня гледзячы на наяўнасьць раду ўзорных прыкладаў бальшавіцкай работы партыйных груп, парторгаў, вымпэргаў, пастаноўка партыйна-масавай работы ў нізавым вытворчым зьвяне застаецца яшчэ слабым месцам у рабоце партыйных арганізацый. Адсюль задача ўсіх парткомаў, парткалектываў і ячэек — ва што-б там ні стала дабіцца рашучага пералому ў гэтай галіне, палепшыць кіраўніцтва і інструктаваньне ў рабоце нізавых партыйных зьвеньняў, аказваючы ім штодзённую практычную дапамогу, пераносячы лепшы вопыт работы партыйных груп, парторгаў і зьвенпоргаў ва ўсе нізавыя зьвеньні.

З мэтай набліжэньня партыйнага кіраўніцтва непасрэдна да вытворчых адзінак у часе падрыхтоўкі і правядзеньня перавыбараў партыйнай арганізацыі была праведзена рэарганізацыя партыйнай сеткі. Ячэйка паравозьнікаў рэарганізавана па прынцыпе пазьлу рабочага парку паравозаў — пасажырскіх, таварных і манэўровых—у тры самастойныя ячэйкі. Ячэйка руху рэарганізавана па прынцыпе паасобных служб—кандукторскія ячэйкі таварных і пасажырскіх цягнікоў. Разбуйнена ячэйка майстэрні шляху і створаны парт'ячэйкі мэханічнага цэху, блёкцэху і групавая ячэйка сьлесараў, арганізавана бюро партыйнага калектыву майстэрні шляху. Рэарганізавана ячэйка цягі парткалектыву Калінкавічы ў тры самастойныя ячэйкі: ячэйка машыністаў, вагоньнікаў і дэпо.

У брыгадах, групах, на паравозах, дзе ёсьць тры члены партыі, арганізаваны партыйныя групы. Ва ўсіх самастойных вытворчых адзінках арганізаваны трыкутнікі, праведзена замацаваньне пастаянных зьмен як на цэзе, так і па руху.

Перавыбары партыйных органаў адбываліся пад знакам рашучай барацьбы з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай, «левымі» загібамі і прымірэнчымі адносінамі да ўхілаў ад лініі партыі. Перавыбары паказалі згуртаванасьць партыйнай арганізацыі вакол ленінскага ЦК, цьвёрдую волю партыйных ячэек дабіцца хутчэйшага выкананьня задач, пастаўленых партыяй перад чыгуначным транспартам.

Перавыбары паказалі ўзрослую актыўнасьць рабочых - чыгуначнікаў, якая выявілася ў новым уздыме творчага энтузіязму. Перадавыя лепшыя ўдарнікі падалі заявы аб уступленьні ў рады партыі. Па дэпо (Гомель) за час перавыбараў падана 20 заяў і па калектыве руху—10 заяў, па парткалектыву ст. Калінкавічы—7 заяў, заводзе Ланцуцкага—25 заяў і г. д. Гэта абавязвае партарганізацыі прыняць усе меры для бальшавіцкага выхаваньня новага папаўненьня.

На перавыбарчых сходах прысутнічалі амаль усе камуністы пры актыўным удзеле шырокіх беспартыйных рабочых мас.

Справаздачна - перавыбарчыя сходы праходзілі пры шырока-разгорнутай унутрыпартыйнай дэмакратыі і бальшавіцкай самакрытыцы, пад знакам мабілізацыі камуністаў на далейшую бязьлітасную барацьбу супроць правага і «левага» апартунізму супроць прымірэнцтва да ўхілаў ад генэральнай партыі.

На сходах выкрыт рад недахопаў у рабоце паасобных ячэек і калектываў. На калектыве руху (Гомель) адзначалася невыстарчальная масавая работа, ячэйкі слаба змагаліся за ўзьнімцьце працдысцыпліны. У ячэйцы майстэрні шляху (Гомель) адзначана слабая пастаноўка марксыцка-ленінскага выхаваньня членаў партыі. Ячэйка слаба змагалася за паляпшэньне якасьці прадукцыі, якая выпускаецца.

У ячэйцы паравозьнікаў гомельскага дэпо адзначалася невыстарчальная барацьба са зрывамі спаранай яазды, слабая падрыхтаванасьць да асеньня-зімовых паравозак, наяўнасьць вялікіх прастояў паравозаў, слабая барацьба з ураўнілаўкай, невыстарчальнае разгортваньне партыйна-масавай работы ў ячэйцы.

Сходы адзначылі слабую пастаноўку работы ячэек па разгортваньні марксыцка - ленінскага выхаваньня кандыдатаў, несваячасовы перавод іх у члены. У значнай частцы ячэек на справаздачных сходах паказалася на слабасьць работы партыйных арганізацый у пытаньнях нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Яшчэ і зараз ёсьць моманты, што рад адцялеў і служб не перавялі сваю работу на беларускую мову (апараты раённага праўленьня, станцыі Гомель-пасажырскай, дэпо Гомель і г. д.).

Пагледаўся рад праўленьняў ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму. Былі моманты, калі ў палітшколах камуністы патрабуюць падручнікаў толькі на расійскай мове, што мела месца ў ячэйцы моцных токаў дэпо Гомель. Выкрыты выпадкі праяўленьня антысэмітызму і шавінізмаў розных масьцей. На задачах барацьбы з гэтымі клясава-варожымі праяўленьнямі мабілізавала ўвага ўсіх зьвеньняў партарганізацыі і рабочых мас.

У працэсе праведзенай справаздачна перавыбарчай кампаніі мелася паасобныя выпадкі яўнага апартуністычных адносін да перавыбараў і парушэньня ўнутрыпартыйнай дэмакратыі. На заводзе імя Ланцуцкага бюро ячэйкі зборнага цэху і сакратар гэтай ячэйкі Драйчук ніякай падрыхтоўчай работы да перавыбараў не праводзілі. Групарганізатары не рабілі справаздач аб сваёй рабоце толькі таму, што ня ведалі, што яны зьяўляюцца групарганізатарамі. Сакратар ячэйкі Драйчук процідзейнічаў правядзеньню дырэктыў парткому, зрываў работу па перавыбарах у гэтым важнейшым цэху заводу. Бюро парткому распусьціла бюро ячэйкі зборнага цэху і вынесла ўсім членам бюро партыйныя спагнаньні.

Парушэньне ўнутрыпартыйнай дэмакратыі ў часе перавыбараў мы мелі ў ячэйцы старога дэпо Гомель. Гэта выявілася ў тым, што калі партыйны сход ня выбраў у склад бюро старога сакратара ячэйкі, дык на другі дзень партком дэпо правёў другі раз сход ячэйкі і па гэтым сходзе папыраў бюро з 5-ці да 7-ми чал. з тэй толькі мэтай, каб увесьці ў склад бюро былога сакратара. Пастановай бюро Гомельскага гаркому выбары бюро пэх'ячэйкі старога дэпо Гомель былі адменены і даны адпаведныя ўказаньні парткому дэпо.

Гэты ўрокі дзьвёх ячэек былі ўлічаны ўсё партыйнай арганізацыяй пры правядзеньні перавыбарчай кампаніі партыйных органаў, даючы рашучы адпор апартуністычным элемэнтам, якія прабавалі прынізіць палітычнае значэньне перавыбарчай кампаніі.

У выніку праведзеных перавыбараў колькасьць пэх'ячэек значна павырасла. Калі мы да перавыбараў мелі 70 ячэек, дык зараз маем 86. Пашырэньне галоўным чынам ішло за лік разбуйненьня і арганізацыі новых ячэек. Арганізаваны новыя ячэйкі на ст. Аўрамаўская, Дзёмкі, Хойнікі, Уза, Ціч і г. д. Значна пашырылася сетка партыйных груп і зьвенпартарганізатараў у брыгадах і зьвенах. Перавыбары высунулі новыя кадры актыву з лепшых рабочых вытворчасьці. На большасьці паравозаў дэпо Гомель палепшыўся сацыяльны склад партыйных арганізатараў і зьвенпарганізатараў. Высунутыя на гэту работу, у большасьці камуністы, упарэйшаю далучаюцца да кіраўнічай работы. Гэта абавязвае партыйныя ячэйкі аказваць ім больш штодзённай, практычнай дапамогі і інструктаваньня ў іх рабоце.

Кожная партыйная ячэйка павінна замацаваць дасягнуты пералом у перабудове партыйнай работы, палепшыць партыйную работу ў цэху, брыгадзе, групе, паравозе, арцелі, станцыі, дыстанцыі і г. д., паказваючы вопыты станоўчай работы. Адначасова завастраючы ўвагу ўсіх камуністаў на фактах адмоўнай работы, трэба ўстанавіць жывы інструктаж партыйных груп, партарганізатараў, дабіцца, каб яны акцыпняўлі штодзённы кантроль за выкананьнем сваіх пастаноў, забясьпечыць пастаянную праверку выкананьня рашэньняў, вынесеных у працэсе перавыбараў перш за ўсё і ў асабліваасьці па пытаньнях перабудовы партыйна-масавай работы і ўмацаваньня нізавых партыйных зьвеньняў.

Правільнай расстаноўкай партыйных сіл на рашаючых участках работы транспарту, шырокім разгортваньнем бальшавіцкай самакрытыкі, узмацненьнем работы на марксыцка-ленінскім выхаваньні, вядучы барацьбу супроць усялякіх праяў апартунізму, супроць шавінізму розных масьцей, асабліва ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, выкарыстоўваючы кожнасьць, бюракратызм, «очковтирательство» ў рабоце—мы дабіемся поўнага выкананьня шасьці ўмоў тав. Сталіна, пастаноў кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б) і абвешчанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб транспарце, а гэтым самым забясьпечым пасьпяховае правядзеньне асенне-зімовых перавозак.

Пілотная калібровочная мішэнь LRT-BE4-V2

Толькі кампартыя можа разьбіць ланцугі імпэрыялізму

Гаміндан, як палітычная сіла, перастаў існаваць
Дэкларацыя Сун Цзі-лінь

ШАНХАЙ, 21. **Сун Цзі-лінь** — жонка Сун Ят-сэна, апублікавала дэкларацыю, у якой заяўляе, што гаміндан, як палітычная сіла, перастаў існаваць і што яго ўласныя лідэры зьвялі яго палітычную ролю на нішто, што **рэвалюцыя загнана ў падполье, а адданыя і сумленныя рэвалюцыянэры сыстэматычна асуджаліся на катаваньні і кары сьмерці.**

Закранаючы бесьперапынныя палітычныя інтрыгі, Сун Цзі-лінь заяўляе, што няма нічога дзіўнага ў тым, што гаміндан канчаткова дыскрэдытаван і зьяўляецца «прадметам нянавісьці ўсёй нацыі». Кантон і Нанкін перад грамадзкай думкай прабавалі часова спыніць адкрытую барацьбу і на працягу трох месяцаў займаліся інтрыгамі вакол аб'яднальнай канфэрэнцыі, на якой асноўныя разгалосьсі зводзіліся да падзелу здабычы. Ніводнага слова пя было сказана з повану страшэннай галечы сялян і рабочых. **Толькі кампартыя**, арганізаваная на аснове рабоча-сялянскай палітыкі, **можа стварыць фундамант сацыялізму, зламаць сілу мілітарызму і разьбіць ланцугі імпэрыялізму.**

Закранаючы студэнцкія дэманстрацыі, Сун Цзі-лінь гаворыць, што паводле загаду імпэрыялістычных паслоў «аб'яднаны» ўрад прабаваў задушыць патрыятычны рух, пусьціўшы ў ход салдат і бандытаў, якія зьбівалі прыкладамі студэнтаў і гналі іх з гораду, як скаціну. І такая жорсткасьць ужываецца ў той час, калі імпэрыялістычная армія набліжаецца да Цзіньчжоу. Вельмі побра відома, што **«аб'яднаны» ўрад складаецца з японскіх, французскіх, ангельскіх і амэрыканскіх агентаў. Толькі рэвалюцыя, якая створана масамі і падтрымліваецца масамі, можа зламаць сілу мілітарыстаў, палітыканаў і імпэрыялістаў і сапраўды пабудаваць сацыялізм.** Пя гледзячы на тэрор рэакцыйных сіл, масы не адмовяцца ад свайго абавязку, які дыктуецца цяжкім становішчам усёй краіны, і будуць энэргічна працаваць і пераможна ісьці да мэты, высунутай рэвалюцыяй.

Супярэчнасьці паміж імпэрыялістамі ў Манчжурыі абвастраюцца

ЛЕНДАН, 21. Шанхайскія карэспандэнты буржуазных газэт займаюць розка адмоўную пазыцыю ў адносінах да нагрозы Японіі акупаваць Цзіньчжоу. Шанхайскі карэспандэнт лібэральнай «Нью-Кронікль» піша:

«Нельга сур'ёзна прымаць пад увагу магчымасьць прасоўваньня кітайскіх войск на поўнач. Брытанскі ваенны аташэ ў Кітаі Торнхіл у паведамленьні з Мукдэну адзначае, што весткі аб канцэнтрацыі кітайскіх войск у раёне Цзіньчжоу — недарэчныя. Шанхайскі карэспандэнт кансэрватыўнай «Таймс» задае пытаньне, да чаго даходзяць межы японскіх дапаганьняў у Манчжурыі. «У выніку таго, піша далей карэспандэнт, — што наступіў доўгі сьвяточны перапынак з прычыны калядаў у работах Лігі, і што дагэтуль яшчэ не назначаны члены камісіі, якая пасылаецца ў Манчжурыю для абсьледаваньня становішча, абсьледавацелі Далёкага Ўсходу вічаць, што падзеі ў Манчжурыі прадастаўлены разьвіцьцю самім сабе і што інтарэсы Кітаю і іншых дзяржаў могуць быць парушаны ў якувазнай дагэтуль ступені.

У нерадаўным артыкуле лейбарыстская «Дэйлі гэральд» піша, што японская палітыка яўна накіравана на ачышчэньне Манчжурыі ад апошніх рэшткаў кітайскай улады пакіталт таго, як гэта было зроблена ў Карэі. (ТАСС).

425.000 зарэгістраваных беспрацоўных у Японіі

ТОКІЕ, 18. У верасьні бягучага году, паводле афіцыяльных даных, зарэгістравана 425.000 беспрацоўных, што зьяўляецца найвышэйшай лічбай на працягу многіх год. У гэтую лічбу ня ўключана вялікая колькасьць незарэгістраваных беспрацоўных. У афіцыяльных паведамленьнях міністэрства ўнутраных спраў указваецца, што **беспрацоўе ўсё больш расьце.**

Войскі і паліцыя супроць бастуючых

ШАНХАЙ, 21. 19 сьнежня 5.500 рабочых 2-х баваўняна-папяровых фабрык буйной кітайскай фірмы ва Усуне абвясьцілі забастоўку, прад'явіўшы эканамічныя патрабаваньні. Бастуючыя паладзілі дэманстрацыю, якая суправаджалася псаваньнем машын. Выкліканыя вайсковыя часьці і паліцыя **адкрыла агонь па дэманстрантах. Забіта 3 рабочых, у тым ліку адна жанчына.** Учора да бастуючых далучыліся яшчэ 6.000 рабочых. Бастуючыя сабраліся каля фабрыкі, дзе дэманстравалі пад чырвонымі сьцягамі, кідаючы камуністычныя лёзунгі. Ва Усуне абвешчана ваеннае становішча. У Тупуне (прамысловы раён Шанхая) **забаставала 7.000 рабочых буйной тытунёвай фабрыкі.** (ТАСС).

Банкруцтва 23 банкаў за адзін дзень

Н'Ю-ЕРК, 17. Фінансавы крызіс у ПАЗШ усё больш абвастраецца. 14 сьнежня **збанкрутавалі 23 невялікіх банкі.** Паніка пашырылася таксама на так званую «новую Англію» (Штат Масачузэтс). Крах буйнога банку 15 сьнежня выклікаў спыненьне плацяжоў многімі невялікімі банкамі ў розных прамысловых гарадох Масачузэтса. На працягу гэтага тыдню ў «новай Англіі» пацярпелі крах 14 банкаў з агульнай сумай укладаньняў у 80 млн. даляраў. У сувязі з банкаўскімі крахамі і ліквідацыяй раду прадпрыемстваў, курсы ўсіх акцый і аблігацый рэзка зьнізіліся. Паводле паведамленьня органу гандлёвых колаў «Джорналь Оф коммэрс», сур'ёзна абгаворваецца пытаньне аб адмаўленьні ПАЗШ ад залатога стандарту. (ТАСС).

Банкруцтва францускага банку

ПАРЫЖ, 18. Спыніў плацяжы буйны с.-г. банк. Банк не дачакаўся ўхваленьня сэнатам ужо прынятай палатай дэпутатаў пастановы аб выдачы банку пазыкі ў разьмеры 100 млн. франкаў.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Удасканаленьне цагельнага прэсу

Чыгуна-ліцейныя майстэрні **Слуцкага райкамбінату** ўдасканалілі мэханічны глінамялны цагельны прэс. Раней за 8 гадзін прэс даваў 2.000 шт. цэглы, зараз ён выпускае за адну гадзіну 1.500 шт. Гэты прэс устаноўлен ужо на адным з цагелень слуцкага камбінату і даў вельмі станоўчыя вынікі.

Нядаўна прэзыдыум ВОНГБ запаміў сь з вынікамі ўжываньня ў вытворчасьці ўдасканаленага прэсу (вэртыкальнай мэханізаванай глінамялкі). Прэзыдыум адзначыў, што гэта вынаходзтва дае значнае павялічэньне прадукцыйнасьці працы па цагельна-керамічнай вытворчасьці, дае магчымасьць рацыянальна скарыстаць рабочую сілу. Прызнана мэтазгодным ужываць мэханізаваныя глінамялкі на керамічных заводах мясцовай, саматужнай і калгаснай прамысловасьці.

Вываз торфу

Паводле даных Белторфу квартальнае заданьне па вывазцы торфу выканана на 31,9 проц. Заводы, за вывазку торфу з якіх адказвае Белторф, вывезьлі 52,6 проц. квартальнай праграмы; заводы, дзе за вывазку адказваюць спажыўцы, выканалі 22,7 проц.

Найлепшыя вынікі даў **Асінторф**— 79,6 проц. На другім месцы стаяць торфазаводы **«Міханавічы» і «Шлях сацыялізму»**, якія выканалі звыш паловы пляну. Значна адстаюць заводы **«Давыдаўка», «Грабянёва», «Чырвоны Кастрычнік»** і **«Новая Беларусь».**

На рашаючых вучастках

Трактары. Сталінградзкі трактарны завод зьняў з канвэеру 18 сьнежня 114 трактараў. За 19 сьнежня даных няма.

На харкаўскім трактарным выпушчана 19 сьнежня 27 трактараў і 30 матораў.

«Чырвоны пуцілавец» даў 82 трактары і 67 матораў.

Завод імя Сталіна (**был. «АМО»**) 19 сьнежня выпусьціў 22 аўтамашыны і 20 матораў.

Мэталь. За 17 сьнежня выплаўлена 14.309 тон чыгуну і 12.246 тон сталі.

Вугаль. Капальні Данбасу 19-га сьнежня далі 137.900 тон вугалю супроць 139.088, атрыманых за мінулыя суткі. Мэханізаваным шляхам здабыта 89.140 тон супроць 90.455, атрыманых 19 сьнежня.

Масквавугаль даў 19-га сьнежня 8.232 тоны, Кузбас — 19.644.

Камсамольская істужка куш нервай фабрыкі перавыканала прамфінплян

Да 20-га сьнежня камсамольская істужка **кушнернай фабрыкі імя 1-га мая** выканала гадавы прамфінплян на 104 проц. 22 сьнежня адбыўся мітынг рабочых **камсамольскай істужкі**, якія ўзялі на сябе абавязак дапамагчы адсталым істужкам, ня зьніжаць дасягнутых тэмпаў і змагацца за атрыманьне пераходнага сьцягу.

МЕНСК і ГОМЕЛЬ ПЕРАВЫКАНАЛІ ГАДАВЫ ФІНПЛЯН

Рапарты пераможцаў

ЦК КП(б)Б, ЦВК, СНК і НКФ БССР

Дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партыйнай арганізацыі, шырокаразгорнутай масавай рабоце, ужываньню сацыялістычных мэтадаў працы і рашучай барацьбе з усімі відамі апартунізму ў мабілізацыі сродкаў; **Менск выканаў фінплян** 4-га кварталу на103,3 проц.

Прымаем усе меры для далейшага перавыкананьня пляну і забесьпячэньня посьпеху ў мабілізацыі сродкаў у чацьвертым апошнім годзе пяцігодкі.

Менгарком КП(б)Б—**КАВАЛЬЧУК.**
Гарсавет—**КАРАНЕЎСКІ.**
Гарпрафсавет—**ШУЛЬКІН.**

***

ГОМЕЛЬ. (Па тэлеграфу). Пад кіраўніцтвам гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету, дзякуючы вялікаму энтузіязму працоўных Гомельшчыны і актыўнаму ўдзелу камсамолу і газэты «Палеская праўда», пралетарыят Гомелю ажыцьцявіў свае абяцаньне — скончыць выкананьне фінпляну да сэсіі ЦВК СССР. Да 20 сьнежня гадавы фінплян выкананы на 102,6 проц., квартальны — на 102,1 проц. Работа працягваецца.

Гарком — РУБІН, гарсавет — ХАЎКІН, гарпрафсавет — АПЕНГЭЙМ, «Палеская праўда» — ЗЭЛЬМАНАЎ, гарфа — КАРПМАН.

Ляднянскі савет упередзе

ДУБРОЎНА. (БЕЛТА). ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ЛЯДНЯНСКІ МЕСТАЧКОВЫ САВЕТ, ДУБРОЎЕНСКАГА РАЁНУ, ДА 10 СЬНЕЖНЯ ПЕРАВЫКАНАЎ ФІНПЛЯН 4-ГА КВАРТАЛУ. РАБОЧЫЯ БРЫГАДЫ ПРАВЯЛІ ВЯЛІКУЮ МАСАВУЮ РАБОТУ СЯРОД НАСЕЛЬНІЦТВА. У КАРОТКІ ТЭРМІН САВЕТ ДАВІЎСЯ ПОЎНАГА ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ УЦЯГНЕНЬНЯ ЎКЛАДЧЫКАЎ У АПЧАДКАСУ.

ШЫРОКА РАЗГАРНУЛАСЯ ДАДАТКОВАЯ ПАДПІСКА НА ПАЗЫКУ ІМЯ «3-ГА РАШАЮЧАГА». РЭАЛІЗАЦЫЯ ДАЛА 8.000 РУБЛЯЎ. НА САЦСПАБОРНІЦТВА НА ЛЕПШУЮ ПАДПІСКУ ВЫКЛІКАНЫ ДУБРОВЕНСКІ ГАРСАВЕТ І САЗОНАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ.

IX-ты Ўсебеларускі зьезд саюзу працаўнікоў асьветы

Савецкая Беларусьстановіцца рэспублікай суцэльнай пісьменнасьці

Чарговы зьезд ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНАГА настаўніцтва БССР сабраўся ў вельмі адказны момант сацыялістычнага будаўніцтва і культурнай рэвалюцыі. Пад ленінскім кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі рабочая клясa Савецкага Саюзу з гістарычнымі перамогамі і буйнымі посьпехамі канчае рашаючы год пяцігодкі, завяршае фундамант сацыялістычнай эканомікі. Працы зьезду супадаюць з уступленьнем у чацьверты і ЗАКЛЮЧНЫ год пяцігодкі.

ЦК УсеКП(б) у сваёй гістарычнай пастанове аб пачатковай і сярэдняй школе паставіў перад пралетарскай краінай цэлы рад самых актуальных праблем будаўніцтва політэхнічнай школы па Марксу-Леніну.

ПЫТАНЬНІ, ПАСТАЎЛЕНЫЯ Ў РАШЭНЬНЯХ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ УсеКП(б) І ЦК КП(б)Б АБ ПАЧАТКОВАЙ І СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЕ, ЛІСТ ТАВ. СТАЛІНА Ў ЧАСОПІСІ «ПРОЛЕТАРСКАЯ РЭВОЛЮЦЫЯ», АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ 6 УМОЎ ТАВ. СТАЛІНА, — ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА ТЫМІ ВУЗЛЯКАМІ, ВАКОЛ ЯКІХ ПАВІННА БЫЦЬ СКАНЦЭНТРАВАНА УСЯ ЎВАГА ШМАТТЫСЯЧНАГА ЎДАРНАГА НАСТАЎНІЦТВА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ, УСЯ РАБОТА ЯГО ІХ-ГА ЗЬЕЗДУ.

***

Зьезд распачаў сваю работу 20 сьнежня ў Доме працаўнікоў асьветы.

На першым пасяджэньні з вялікай прамовай выступіў тав. ЧАРВЯКОЎ.

З дакладам ад усесаюзнага Цэнтральнага Камітэту працаўнікоў асьветы выступіў тав. ЭСТРЫН. Дакладчык разгарнуў паказ тых дасягненьняў на культурным фронце, якіх дабілася рабочая кляса Савецкага Саюзу на аснове агульных дасягненьняў сацыялістычнага будаўніцтва.

У 1913 г. у былой царскай Расіі процант пісьменнасьці раўняўся толькі 22.

Савецкі Саюз у 1926 г. меў ужо 50 проц., а ў 1930 г. — 62 ПРОЦ. пісьменнага насельніцтва.

У 1914 г. у былой царскай Расіі вучылася ў пачатковай школе 7.200 тыс. дзяцей.

У 1931 г. у пачатковых школах Савецкага Саюзу вучыцца 15 з паловаю млн. дзяцей.

Расьце армія настаўніцтва. У 1929-30 годзе у СССР было 391 тыс. настаўнікаў, у 1930-31 г. — 485 тыс., у 1931-1932 г. патрабуецца 653 тыс.

Такі бурны рост настаўніцтва выклікаецца шырокім разгортваньнем барацьбы за суцэльную пісьменнасьць.

У сваім дакладзе тав. ЭСТРЫН паставіў перад настаўніцтвам Савецкай Беларусі тыя неадкладныя задачы, якія вынікаюць з пастановы ЦК партыі аб школе і з 6 умоў тав. Сталіна.

Зьездам пасланы прывітаньні тав. СТАЛІНУ і ЦК УсеКП(б), АДПУ у зьвязку з 14-цігадовым юбілеем, ЦК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР.

Зьезд вітала дэлегацыя падшэфнай чырвонаармейскай часьці. У адказ на прывітаньне дэлегаты ўхвалілі ўзнагародзіць падшэфны эскадрон баявым сьцягам.

На ранішнім пасяджэньні 21 СЬНЕЖНЯ заслухан даклад тав. ДВАРЭЦКАГА аб рабоце цэнтральнага праўленьня саюзу працаўнікоў асьветы БССР.

Тав. Дварэцкі ў сваім дакладзе адзначыў вялікую ўвагу тэй барацьбе, якая вялася і вядзецца супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму які ўяўляе галоўную небясьпеку на данным этапе, тав. Дварэцкі спыніўся на рэзкіх шаньках вялікадзяржаўніцкіх выступленьняў праф. КРУКОВА, настаўніка ЧУДЗІНАВА, настаўніцы ЗАСІМАВАЙ і інш., на барацьбе з беларускім контрэвалюцыйным сацыяльна-дэмакратызмам і шавінізмам іншых колераў.

ПА БССР АХОП ДЗЯЦЕЙ ВА ЎЗРОСЬЦЕ 8-11 ГОД РАЎНЯЕЦЦА 95 ПРОЦ. ДА 1-ГА МАЯ 1932 Г. САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ ПАВІННА СТАЦЬ РЭСПУБЛІКАЙ СУЦЭЛЬНАЙ ПІСЬМЕННАСЬЦІ.

Гэта патрабуе сапраўды ЎДАРНЫХ, сапраўды БАЛЬШАВІЦКІХ тэмпаў работы нашага настаўніцтва.

За апошні год значна павялічылася зарплата ўсіх катэгорый настаўніцтва. Напрыклад, для настаўніцтва тэхнікумаў зарплата павялічылася на 75 проц., для другога канцэнтру сямігодкі — на 25 проц., для першага канцэнтру — 62 проц., пачатковай школы 52 проц. і г. д.

Усё-ж, ня гледзячы на ЗНАЧНАЕ ПАЛЯПШЭНЬНЕ матар'яльных і бытавых умоў настаўніцтва, дырэктывы партыі па гэтым пытаньні яшчэ ВЫКОНВАЮЦЦА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА.

Зьезд заслухаў прывітаньне тав. БУБНОВА ад працаўнікоў асьветы Заходняй вобласьці.

На вячэрнім пасяджэньні 21 СЬНЕЖНЯ разгарнулася абгаварэньне заслуханых дакладаў. Выступалі таварышы: ГАРБАЧЭНКА, ЛОЗІН (Гарэлок), НІКІЦІН, КОРСАК (Полацак), ЧАРНУШОВА, ВАРОНІЧ, ДЗЯМЕНЦЕЎ, МЯЛЕШКА (Старобін), АНЦУКЕВІЧ (Ельскі раён), СУША, ШПАКОЎСКІ, ЗАРАМБОЎСКІ і інш.

Зьезду рапартавалі дэлегацыі БАРЫСАЎСКАГА І ГАРАДОЦКАГА раёнаў.

Лёгкаплаўная гліна у раёне БЕЛДРЭС

Горная група ВСНГБ знайшла вялікарныя залежы лёгкаплаўных глін у раёне БелДРЭС і Чэрвеншчыны. Глины прыгодны для варкі простага шкла (бутэлек, кансэрвовых банак і г. д.). Вопыты, арганізаваныя шклоаб'яднаньнем, далі добрыя вынікі.

Паведамленьне

— Дом Камасьваты. 22-XII, ад 7-9 гадз. веч. — Індывідуальная кансультацыя па гісторыі УсеКП(б) і КП(б)Б і па парт. будаўніцтве.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

РАДЫЁГРАМА.

Усім сакратаром РК КП(б), усім рэдактаром раённых газэт.

Па ініцыятыве Цэнтральнай Конкурснай камісіі, „Зьвязда" і „Рабселькор" прыступаюць да правядзеньня з 25-XII да 5-I усебеларускага рэйду цэнтральнага раённага і нізавога друку па праверцы ажыцьцяўленьня ў калгасах, саўгасах і МТС шасьці ўмоў тав. Сталіна (ужываньне зьдзельшчыны і ўвядзеньне прагрэсыўнай зьдзельшчыны, пастаноўка ўліку працы, ліквідацыя абязьлічкі і г. д.).

Неабходна прыняць усе меры да падрыхтоўкі рэйду і забясьпячэньня масавага ўдзелу ў ім партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацыі, нізавога друку і рабселькораў, усіх калгасьнікаў і рабочых саўгасаў і МТС.

Вынікі рэйду прысылайце ў Цэнтральную Конкурсную Камісію ў адрес газэты „Зьвязда"

Культпроп ЦК КП(б)Б.

Выдавецтва ЦК КП(б)Б „ЗЬВЯЗДА"

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ СВАЯЧАСОВА на 1932 год

НА ГАЗЭТЫ	Пэрыядычнасьць	На 1 м.	На 3 м.	На 6 м.	На год
ЗЬВЯЗДА орган ЦК КП(б)Б	штодзённа	1—	3—	6—	12—
РАБСЕЛЬКОР орган Культпр. ЦК КП(б)Б Выданьне газ. „Зьвязда"	Раз у пяцідзеньку	—20	—60	1.20	2.40
ОРКА (На польскай мове) Орган ЦК КП(б)Б	2 разы ў пяцідзеньку	—25	—75	1.50	3—
РАЎДАНАСІЦ АРТОЯС Выдан. (На літоўскай мове) ЦК КП(б)Б	Раз у пяцідзеньку	—	—45	—90	1.80
НА ЧАСОПІСІ:					
Бальшавік Беларусі Орган ЦК КП(б)Б	2 разы ў месяц	—40	1.20	2.40	4.80
Работніца і калгасьніца Беларусі Выданьне ЦК КП(б)Б	3 разы ў месяц	—20	—60	1.20	2.40

Падпіска прымаецца: на пошце, лістаносцамі і ўпаўнаважанымі па друку ва ўсіх прадпрыемствах і установах БССР.

Заўтра, 24 сьнежня, у 10 гадзін раніцы ў габінэце рэдактара „Зьвязды"

адбудзецца чарговае пасяджэньне

цэнтральной камісіі па кіраўніцтву абвешчаным „Правдой" конкурсам

нізавых газэт калгасаў, саўгасаў і МТС на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Яўка без спазьненьня ўсіх членаў камісіі абавязкова.

Цэнтральная Конкурсная Камісія.

Кіно „Чырвоная Зорка" Ад серады, 23 сьнежня

ЛЕПШЫ АМЭРЫКАНСКІ НАСТАЦЫІ ФІЛЬМ

ПРАЕКТ Інжынэра Стронга

(цаною жыцьця)

— драма ў 6 частках. —

РЭЖЫСЭР Рэльф Інс. Штодзённа 4 сэансы

Печатан сэансаў а 6 г., 7-30, 9, 10-30.

Касы адкрыта з 1 гадз. дня — — (— Дзеці ў кіно не дапускаюцца.

Пасьля 3-га званка ўваход у залю забараняецца

Кіно КУЛЬТУРА Ад 22-XII на экране новы фільм

БІЧ ЧАСУ

у 6-ці частках

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ НОВАЯ ЗАМЕЖНАЯ КАМЭДЫЯ

ПАЕЗДКА НА ДАЧУ

у 2 частках.

Печатан сэансаў у 7 гадзін.

АССА—з 6 гадзін.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"

Толькі 3 дні 23, 24 і 25 сьнежня

настоцкі замежны фільм

ДЗЕЛЯ ДЗІЦЯЦІ

драма ў 6 частках.

Звыш праграмы хроніка „САЮЗКІНО".

ПАЧАТАК сэансаў у 2, 3-30, 6, 7-30, і 10-30.

КАСЫ адкрыты з 12 гадз. дня.

З 1-га студзеня 1932 году ПРЫ РАБФАКУ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСЫТЭТУ адкрываюцца

КУРСЫ па падрыхтоўцы ў рабфак БДУ.

На курсы прымаюцца рабочыя, якія маюць месьц не менш 3-гадовага рабочага стажу і калгаснікі. Стыпендыяні і інтэрнатам слухачы курсаў забясьпечаны на будуць. Прыем заяў утворацца ў кавыдзлярні рабфаку (Університэцкі гарадок, галоўны корпус, 3-ці паверх, пакой 305) з 9-ці гадзін раніцы да 4-х дня і ад 6 да 8-ай гадзіны вечара. При заявах павінны прыкладацца ўсе дакументы, якія прадстаўляюцца пры прыёме на Рабфак. Заявы будуць прымацца да 30-га сьнежня.

Дэкан Рабфаку БДУ РАМАНОВІЧ.

„Інтэрнацыянал" Настаўцы фільм Востраў бегляноў

Звыш праграмы— кіно-хроніка Саюзкіно

21-га сьнежня 1931 г. па вул. Леніна, № 15 АДКРЫВАЕЦЦА УНІВЕРСАЛЬНЫ МАГАЗЫН „ТОРГСІН" ПАСЫЛАЧНАЯ БАЗА

Продаж усім грамадзянам на замежную валюту і залатую манету (старой чаканкі) і выдача товараў арэндатуры па грамадзкіх пераходах з за-граніцы.

Глуомі раённы саюз прамысловых кааператываў „РАЙПРАМСАЮЗ" з 20 сьнежня 1931 г. ліквідуецца.

Усе заяўленьні арганізацыі з прэтэнзіямі павінны зьвяртацца ў ліквідацыю да 1 студзеня 1932 г. пасьля чаго ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць.

Ліквідком.

ПЛЯНАВЫ ТЭХНІКУМ ДЗЯРЖПЛЯНУ БССР абвяшчае

студэнцкі набор 1932 г. у 70 асоб на вячэрніе групы прамысловага і сельска-гаспадарчага адзяленьняў.

Жадаючыя паступіць павінны надаць да 10 студзеня 1932 г. заявы з наступнымі дакументамі: 1) анкету, заверэную адпаведнымі арганізацыямі; 2) аб сам. паходжаньні і сац. становішчы. 3) аб асьвеце; 4) аб адносінах да вайсковай павінасьці (для мужчын) і 5) аб узросьце і здароўі.

Асьвета паступаючых павінна быць за сямігодку, рабочым і асобы, працуючыя ўжо ў галіне плянаваньня, будуць прымацца з ведамі за 6 нявяку 7-годкі і з апошніх курсаў рабочых школ прадпрыемстваў тыпу.

Студэнты вячэрніх груп тэхнікуму стыпендый і інтэрнатам не забясьпечваюцца.

Плянавы тэхнікум мае сваёй задачай падрыхтоўку пралетарскіх спэцыялістаў—плянавікоў і работнікаў па народна-гаспадарчым вуноту для раённых і гарадзкіх плянавых камісій, гаспадарчых арганізацый (прам. прадпрыемстваў, саўгасаў, калгасаў, МТС) і сэкцый Дзяржпляну.

Заняткі пачнуцца 20 студзеня.

Заявы накіроўваць на адрэс: г. Менск, Камсамольская вул., дом № 23. Плянавому тэхнікуму. (Канцылярыя працуе з 1 гадз. дня да 6 гадз вечара).

Дырэкцыя тэхнікуму.

24 сьнежня, у 7 гадз. веч. у залі БАН адбудзецца

СХОД супрацоўнікаў Інстытуту эканомікі і т-ва эканамістаў-марксыстаў.

У парадку дня—ПЛЯН ПРАЦЫ.

Яўка абавязкова.

Дырэкцыя.

Для распаўсюджаньня выданьняў Беларускай Акадэміі Навук ПАТРЭБЕН

супрацоўнік, які ведае кніжную справу. Аплата працы па згодзе. Заяўкі накіроўваць у БАН.

ЗГУБЛЕНА квітанцыя ашчадкасы № 57 ... на імя ... Лічыць недзейсным.

Пры Рагачоўскім камбінаце кааператыўнай асьветы БЕЛКАПСАЮЗУ

з 1-га студзеня 1932 г. адкрываюцца 6-месячныя КУРСЫ

па падрыхтоўцы рахункаводаў і пом. бухгальтараў

для райсаюзаў спажывецкіх таварыстваў. Курсы разьлічаны на 2 групы па 35 асоб для кожнай групы. У групу пом. бухгальтараў прымаюцца з асьветай не ніжэй 6-ці груп 7-годкі, і забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй ад 45-55 руб. у месяц (кошт харчаваньня—18 руб. у групу рахункаводаў прымаюцца з асьветай не ніжэй 4-5 груп 7-годкі і забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй ад 40-45 руб. у месяц (кошт харчаваньня—18 руб. у месяц). У першую чаргу будуць прыняцца рабочыя, калгаснікі, беднякі, сераднякі, служачыя і дзеці працоўнай інтэлігэнцыі. Курсанты забясьпечваюцца адзеннем і стыпендыі навучальнымі прыладамі і падручнікамі за кошт камбінату. Узрост паступаючых ад 18 год. Для залічэньня неабходна прадставіць у найцыярную камбінату г. Рагачоў Цыганкаўская 15 (калішкола і курс. база, наступныя дакументы: пасьведчаньне аб адукацыі (арыгінал), аб сац. і матар'яльным становішчы, аб стане здароўя і кэтрычны выпіс, які прыймаецца да ўвагі аб залічэньні. Заявы прымаюцца да 25-XII—31 г.

Дырэкцыя камбінату.

Менск, друкарня газ. «ЗЬВЯЗДА».